Державна
Наукова Бібліотека
ім. Короленко. Харків

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 219 (6195) | 21 верасня 1938 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Гісторыя Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс. Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год. Раздзел V. Партыя большэвікоў у годы Ўздыму рабочага руху перад першай імперыялістычнай вайной (1912—1914 годы).

Разгорнем перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва.

Зварот стаханаўцаў рабочых, работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава да ўсіх рабочых і работніц, стаханаўцаў і ўдарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, гаспадарнікаў і служачых Совецкай Беларусі.

А. Глозман, П. Ершоў. — За большэвіцкае выкананне рашэнняў справаздачна-выбарчых сходаў.

А. П. Караленка. — Вялікі гонар.

А. Рамін. — Баі на подступах да Ханькоу.

Да 125-годдзя з дня нараджэння Тараса Шэўчэнкі.

ЗА РУБЯЖОМ:

Чэхаславацкі народ патрабуе адхілення англа-французскіх прапаноў.

Увядзенне папярэдняй цэнзуры ў Чэхаславакіі.

Канцэнтрацыя польскіх і венгерскіх войск на чэхаславацкай граніцы.

Пасяджэнне англійскага кабінета.

Рашэнні совета міністраў Францыі.

Водгукі на англа-французскі план расчлянення Чэхаславакіі.

Прамова Альварэса дэль Вайо на пленуме Ліігі нацый.

На франтах у Іспаніі.

НЕПЕРАМОЖНАЯ СІЛА МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

Сёння ў «Правде» публікуюцца раздзел XII і заключэнне Гісторыі Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Закончана выдатная навуковая праца, у рукі партыі яе Цэнтральным Камітэтам, яе настаўнікам таварышам Сталіным укладзена тэарэтычная зброя каласальнай сілы. У гэтай навуковай працы сціслa і ярка зачатлён увесь шматгадовы слаўны гістарычны шлях і вопыт партыі Леніна—Сталіна.

У найцяжэйшых умовах дзесяткі год змагалася наша партыя на чале рабочага класа за звяржэнне капіталістычнага ладу, за знішчэнне эксплаатацыі чалавека чалавекам, за соцыялізм. **Змагалася і перамагла!** На адной шостай частцы зямнога шара соцыялізм перамог, і ўжо ў 1936 годзе Сталінская Канстытуцыя «замацавала той гісторычна-гістарычны факт, што СССР уступіў у новую паласу развіцця, у паласу завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комуністычнага грамадства, дзе кіруючым пачаткам грамадскага жыцця павінен быць комуністычны прынцып: «Ад кожнага — па яго здольнасцях, кожнаму — па яго патрэбнасцях».

Годам 1935—1937, годам барацьбы партыі большэвікоў за завяршэнне будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і правядзенне новай Канстытуцыі СССР прысвечаны публікуемы сёння XII раздзел Гісторыі ВКП(б). Гэта — раздзел аб зусім нядаўна прайшоўшых годах татэрмінова выкананай другой сталінскай пяцігодкі, якая знамянуе найвярхэйшы росквіт кіруемай большэвіцкай партыяй соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, высокі ўздым яе прамысловасці і сельскай гаспадаркі, рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і завяршэнне калектывізацыі, нарастанне вялікага стаханаўскага руху, здым народнага дабрабыту, культурны рэвалюцыю. Гэта — годы, у якія перамогшы ў нашай краіне соцыялізм даў совецкаму народу ўсё больш і больш, усё больш поўнаважкія плады. Першакласная тэхнікай багата забяспечылі народную гаспадарку сталінскія пяцігодкі; да авалодання гэтай тэхнікай, да асядлання тэхнікі заклікала працоўных партыя большэвікоў. Вялікі вучань Алексея Стаханава быў адказам на сталінскі заклік аб авалоданні тэхнікай. Разварот стаханаўскага руху і натэрміновае выкананне другой пяцігодкі стварылі ўмовы для новага ўздыму дабрабыту і культурнага росту працоўных. У гэтым уздыме «сказалася сіла, магутнасць, непераможнасць нашай совецкай рэвалюцыі. Рэвалюцыі ў мінулым гінулі ад таго, што яны, даўшы народу свабоду, не мелі магчымасці даць яму разам з тым сур'ёзнае паляпшэнне матэрыяльнага і культурнага становішча. У гэтым была іх асноўная слабасць. Наша рэвалюцыя адрозніваецца ад усіх іншых рэвалюцый тым, што яна дала народу не толькі свабоду ад царызма, ад капіталізма, але і карэннае паляпшэнне яго матэрыяльнага і культурнага становішча. У гэтым яе сіла і непераможнасць».

Уся веліч перамог соцыялізма, глыбіня змяненняў, праведзеных у краіне соцыялістычнай рэвалюцыяй,—змяненняў у эканоміцы краіны, у класавым саставе насельніцтва, у жыцці, быту, культурным узроўні працоўных — усё гэта атрымала сваё яркае выражэнне ў Сталінскай Канстытуцыі СССР, якую XII раздзел Гісторыі ВКП(б) характарызуе, як **Канстытуцыю перамогі соцыялізма і рабоча-сялянскай дэмакратыі.**

Велізарныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне тым больш знамянальны, што яны дасягнуты на фоне надзвычай жорсткага эканамічнага крызіса, які ахапіў у 1929—1933 годах капіталістычныя краіны і зноў успыхнуў у другой палавіне 1937 года. Крызіс прывёў да абвастрэння супярэчнасцей паміж імперыялістычнымі краінамі. Краіны-агрэсары—Германія, Японія, Італія прабуюць кампенсаваць страты ад крызіса за кошт іншых, слаба абароненых краін. На велізарным прасторы ад Гібралтара да Шанхая завязалася нешчаслівы вузлоў вайны. Захват Італіяй Абісінніі, італа-германская інтэрвенцыя ў Іспаніі, захват германскімі фашыстамі Аўстрыі, наглае ўтаржэнне японскай ваеншчыны ў Кітай, фашысцкая пагроза Чэхаславакіі — ўсё гэта ўдар па капіталістычных інтарэсах «дэмакратычных» дзяржаў, за кошт якіх агрэсары хочуць перарабіць свет, захваціць сферы ўплыву.

Цішком, неяк непрыкметна, народы апынуліся ў **другую імперыялістычную вайну,** захваціўшы ў сваю арбіту больш поўмільярда насельніцтва зямнога шара.

«Непрыкметна» падкраўшаяся да народаў вайна не можа не быць сур'ёзнейшай небяспекай і для СССР. Вось чаму наша краіна, няўхільна праводзячы мірную палітыку, прыняла ўсе неабходныя меры для ўмацавання абароназдольнасці нашых граніц, баявой гатоўнасці Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота.

Поспехі соцыялізма ў СССР выклікалі ўсё большую злобу падлейшых подлых агентаў фашызма — бухарынска-трацкісцкіх бандытаў, гэтых падонкаў чалавечага роду, якія былі ў змове супроць Леніна, супроць партыі, супроць Совецкай дзяржавы ўжо з першых дзён Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі і ва ўсе гады вялі супроць партыі і совецкай улады змовы, правакацыі, падрыхтоўку зладзейскіх забойстваў кіраўнікоў партыі і ўрада, шкодніцтва, дыверсіі. XII раздзел Гісторыі ВКП(б) расказвае аб ліквідацыі рэшткаў бухарынска-трацкісцкіх шпіёнаў, шкоднікаў, здраднікаў радзімы.

«Гэтыя белагвардзейскія пігмеі, сілу якіх можна было-б прыраўняць усяго толькі сіле нікчэмнай казяўкі, як відаць, лічылі сябе — для пацехі — гаспадарамі краіны і ўяўлялі, што яны на самай справе могуць раздаваць і прадаваць на старану Украіну, Беларусь, Прымор'е.

Гэтыя белагвардзейскія казяўкі забыліся, што гаспадаром Совецкай краіны з'яўляецца совецкі народ, а паны рыкавы, бухарыны, віноўевы, каменевы з'яўляюцца ўсяго толькі — часова знаходзячыміся на службе ў дзяржавы, якая ў любую мінуту можа выкінуць іх са сваіх канцылярый, як непатрэбны хлам.

Гэтыя нікчэмныя лакеі фашыстаў забыліся, што варта совецкаму народу варухнуць пальцам, каб ад іх не асталося і следу.

Совецкі суд прыгаварыў бухарынска-трацкісцкіх ізвергаў да расстрэлу.

НКВД прывёў прыгавор у выкананне.

Совецкі народ адобрыў разгром бухарынска-трацкісцкай банды і перайшоў да чарговых спраў.

Чарговыя-ж справы заключаліся ў тым, каб падрыхтавацца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР і правесці іх арганізавана».

Трыумфам партыі Леніна—Сталіна з'явіліся выбары ў Вярхоўны Совет СССР. Выбары прынеслі бліскучую перамогу сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных, паказалі наймацнейшую сувязь партыі большэвікоў з усім народам, вялікую сілу маральна-палітычнага адзінства совецкага народа, яго згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, якая вяла і прывяла совецкі народ да перамогі соцыялізма.

Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) у раздзеле «Заключэнне» падводзіць асноўныя вынікі слаўнага гістарычнага шляху, пройдзенага большэвіцкай партыяй. Тут паказана, чаму вучыць Гісторыя ВКП(б), у яркай і сціслай форме даецца глыбокае марксісцкае тлумачэнне прычын і ўмоў непераможнасці большэвіцкага кіраўніцтва, тут даецца ключ да разумення і ўсвоення ўсёй гістарычнай мудрасці партыі Леніна—Сталіна.

І, перш за ўсё, «Заключэнне» паказвае вялікую ролю рэвалюцыйнай партыі пролетарыята, партыі новага тыпу, марксісцка-ленінскай партыі, свабоднай ад апартунізма, здольнай падрыхтаваць пролетарыят да рашучых схватак з буржуазіяй і арганізаваць перамогу пролетарскай рэвалюцыі.

Такой партыяй у СССР з'яўляецца большэвіцкая партыя.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя змагла перамагчы таму, што на чале рабочага класа Расіі стаяла іменна такая партыя, — партыя большэвікоў, партыя, якую многа год кавалі Ленін і Сталін, баявая, смелая, рэвалюцыйная партыя ленінізма.

З выключнай сілай паказвае «Заключэнне» вялікае значэнне перадавой тэорыі рабочага руху — марксісцка-ленінскай тэорыі.

«Сіла марксісцка-ленінскай тэорыі заключаецца ў тым, што яна дае партыі магчымасць арыентавацца ў абстаноўцы, зразумець унутраную сувязь навакольных падзей, прадбачыць ход падзей і распазнаць не толькі тое, як і куды развіваюцца падзеі ў сучасным, але і тое, як і куды яны павінны развівацца ў будучым.

Толькі партыя, авалодаўшая марксісцка-ленінскай тэорыяй, можа рухацца наперад упэўнена і весці рабочы клас наперад».

Са сталінскай глыбінёй і мудрасцю «Заключэнне» растлумачвае, што-ж трэба разумець пад авалоданнем марксісцка-ленінскай тэорыяй, паказвае, што марксісцка-ленінская тэорыя ёсць навука аб развіцці грамадства, навука аб рабочым руху, навука аб пролетарскай рэвалюцыі, навука аб будаўніцтве комуністычнага грамадства. Марксісцка-ленінская тэорыя, як навука, не стаіць і не можа стаяць на адным месцы, — яна развіваецца і ўдасканальваецца, узбагачаючыся новым вопытам. «Заключэнне» наносіць меткі ўдар па няправільнаму, дагматычнаму, начотніцкаму падыходу да марксісцка-ленінскай тэорыі, па начотчыках, якія думаюць, што авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй — «значыць добрасумленна завучыць асобныя вывады і палажэнні, якія ёсць у творах Маркса—Энгельса—Леніна, навучыцца своечасова цытыраваць іх і супакоіцца на гэтым, спадзяючыся, што завучаныя вывады і палажэнні падыйдуць для любой абстаноўкі, на ўсе выпадкі жыцця».

«Заключэнне» падкрэслівае, што «Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй зусім не значыць — завучыць усе яе формулы і вывады і чапляцца за кожную літару гэтых формул і вывадаў. Каб авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, трэба, перш за ўсё, навучыцца адрозніваць паміж яе літарай і сутнасцю.

Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй — значыць усвоіць **сутнасць** гэтай тэорыі і навучыцца карыстацца гэтай тэорыяй пры вырашэнні практычных пытанняў рэвалюцыйнага руху ў розных умовах класавай барацьбы пролетарыята.

Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй — значыць умець узбагачаць гэтую тэорыю новым вопытам рэвалюцыйнага руху, умець узбагачаць яе новымі палажэннямі і вывадамі, умець **развіваць яе і рушыць наперад,** не спыняючыся перад тым, каб, выходзячы з сутнасці тэорыі, замяніць некаторыя яе палажэнні і вывады, якія ўжо сталі ўстарэўшымі, новымі палажэннямі і вывадамі, адпавядаючымі новай гістарычнай абстаноўцы.

Марксісцка-ленінская тэорыя ёсць не догма, а кіраўніцтва да дзеяння».

Ленін і Сталін адстаялі марксісцка-ленінскую тэорыю ад усіх ворагаў рабочага класа і развілі гэтую **навуку, узбагацілі** яе новым вопытам, **рушылі яе далёка наперад.** Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) прыводзіць найярчэйшыя прыклады развіцця Леніным марксісцкай тэорыі: 1) выстаўленне Леніным у красавіку 1917 года, у перыяд пераходу ад буржуазнай рэвалюцыі да соцыялістычнай, лозунга арганізацыі рэспублікі Советаў, як лепшай палітычнай формы дыктатуры пролетарыята; 2) вывад Леніна аб магчымасці перамогі соцыялістычнай рэвалюцыі ў адной, асобна ўзятай краіне. І ў тым і ў другім выпадку Ленін рухаў наперад марксісцкую тэорыю, узбагачаючы яе новым вопытам.

Партыя большэвікоў, яе правадыры Ленін і Сталін заўсёды стаялі на пазіцыях не дагматычнага, а **творчага марксізма.**

«Можна сказаць без пераўвелічэння, што пасля смерці Энгельса найвялікшы тэарэтык Ленін, а пасля Леніна—Сталін і другія вучні Леніна — былі адзінымі марксістамі, якія рухалі наперад марксісцкую тэорыю і ўзбагацілі яе новым вопытам у новых умовах класавай барацьбы пролетарыята.

І іменна таму, што Ленін і ленінцы рушылі наперад марксісцкую тэорыю, ленінізм з'яўляецца далейшым развіццём марксізма, марксізмам у новых умовах класавай барацьбы пролетарыята, марксізмам эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэвалюцый, марксізмам эпохі перамогі соцыялізма на адной шостай частцы зямлі».

Да авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй заклікае партыя большэвікоў усіх сваіх членаў, бо гэтая тэорыя—мацнейшая зброя ў руках рабочага класа, мацнейшая зброя ў баях за комунізм.

Невычарпальнае багацце тэарэтычнай мыслі сканцэнтравана ў ітогавых вывадах «Заключэння». Аналіз барацьбы з дробна-буржуазнымі партыямі (эсэрамі, меншавікамі, анархістамі, нацыяналістамі) і разгрому іх, аналіз барацьбы і разгрому розных апартуністычных груп унутры партыі («эканамістаў», меншавікоў, трацкістаў, бухарынцаў, нацыянал-ухілістаў), якія з'яўляліся па сутнасці справы агентамі, ахвоспем меншавізма, — пацвярджае ўсю гістарычную необходнасць і заканамернасць бязлітаснай барацьбы партыі супроць апартуністычных элементаў, супроць рознага ахвосця меншавізма, супроць капітулянтаў і здраднікаў.

«Нельга лічыць выпадковасцю, што трацкісты, бухарынцы, нацыянал-ухілісты, змагаючыся з Леніным, змагаючыся з партыяй, скончылі тым-жа, чым скончылі партыі меншавікоў і эсэраў, — сталі агентамі фашысцкіх разведак, сталі шпіёнамі, шкоднікамі, забойцамі, дыверсантамі, здраднікамі радзімы» **(Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў).**

«Заключэнне» ў якасці аднаго з урокаў гісторыі партыі ўказвае на крытыку і самакрытыку, як на метад выхавання партыйных кадраў і мас. У гэтым — адна з умоў непераможнасці партыі Леніна — Сталіна.

Яркім мастацкім вобразам выдатнага героя грэчаскай міфалогіі — Аятэя — заканчваецца «Заключэнне».

«Я думаю, што большэвікі нагадваюць нам героя грэчаскай міфалогіі, Антэя. Яны, таксама, як і Антэй, моцны тым, што трымаюць сувязь са сваёй мацер'ю, з масамі, якія парадзілі, ускармілі і выхавалі іх. І пакуль яны трымаюць сувязь са сваёй мацер'ю, з народам, яны маюць усе шансы на тое, каб астацца непераможнымі.

У гэтым ключ непераможнасці большэвіцкага кіраўніцтва» **(Сталін).**

Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), адобраная ЦК ВКП(б),—каштоўнейшы уклад у скарбніцу ленінізма, ў перадавую тэорыю, пераўтвараючую свет.

Гісторыю Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) будуць вывучаць у нашай краіне мільёны большэвікоў партыйных і непартыйных. Яе будуць вывучаць нашы браты і таварышы за рубяжом, будуць па ёй вучыцца змагацца і перамагаць, як змагалася і перамагла вялікая партыя Леніна — Сталіна.

«ПРАВДА» ад 19 верасня 1938 г.

РАЗГОРНЕМ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Зварот стаханаўцаў рабочых, работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава да ўсіх рабочых і работніц, стаханаўцаў і ўдарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, гаспадарнікаў і служачых Совецкай Беларусі

Дарагія таварышы!

Набліжаецца дзень усенароднай урачыстасці — дзень XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла новую эру ў жыцці народаў, у жыцці ўсяго чалавецтва. Пад кіраўніцтвам вялікай партыі большэвікоў, пад кіраўніцтвам геніяльных стратэгаў рэвалюцыі Леніна і Сталіна рабочыя і сяляне нашай краіны зверглі капіталістаў і памешчыкаў і ўстанавілі ўладу Советаў—дыктатуру пролетарыята.

Выдатная мэта, за якую пралівалі сваю кроў лепшыя сыны народа ў гераічныя дні Кастрычніка і ў годы грамадзянскай вайны, ажыццёўлена. Соцыялізм перамог у нашай краіне канчаткова і беспаваротна. Карыстаючыся пладамі сваіх перамог, народ зажыў шчаслівым, заможным соцыялістычным жыццём.

Сталінскія пяцігодкі пераўтварылі твар нашай краіны. Новае, нябачнае аблічча набылі нашы гарады і вёскі, нашы палі і рэкі. У рэзультаце сталінскіх пяцігодак СССР ператварыўся ў магутную індустрыяльную дзяржаву, у краіну самай перадавой соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Перамогі соцыялізма, правы совецкіх грамадзян, — права на працу, права на адпачынак, асвету, забеспячэнне па старасці—замацаваны ў найвялікшым дакуменце нашай эпохі—Сталінскай Канстытуцыі.

Вялікая і гераічная гісторыя нашай барацьбы за соцыялізм знайшла сваё дастойнае апісанне ў толькі-што вышаўшым Кароткім курсе гісторыі ВКП(б). Па гэтай кнізе мы ўсе, пад кіраўніцтвам партыі, будзем вучыцца майстэрству атрымліваць новыя бліскучыя перамогі на славу нашай любімай радзімы.

Соцыялістычная рэвалюцыя, пакончыўшая з векавым рабствам і прыгнечаннем, узняла да творчага жыцця многамільённыя слаі народных мас. На вялікую вышыню ўзнята ў нашай шчаслівай, квітнеючай краіне дастоінства чалавека. Совецкія людзі скрозь і ўсюды праяўляюць цуды гераізма, доблесці і адвагі, на кожным кроку дэманструючы глыбокую жыццёвую сілу соцыялізма, магутнасць і маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, несакрушальную сілу вялікай краіны Советаў.

Гэту сілу адчулі некалькі тыдняў таму назад японскія самураі, якія прабавалі захапіць кавалак нашай свяшчэннай совецкай зямлі. Доблесныя сыны народа, гарачыя патрыёты сваёй совецкай радзімы, армія Далёкаўсходняга фронта абрушыла на ворага ўсю жалезную сілу магутнай тэхнікі, якой аснасціў наш народ сваю любімую Чырвоную Армію. І няхай ведаюць нашы ворагі, што такі-ж лёс пасягне кожнага, хто асмеліцца парушыць свяшчэнныя рубяжы краіны соцыялізма, хто пазарыцца хоць на малую толіку багацтваў, якія здабыты крывёю нашых лепшых сыноў, доблеснай працай многамільённага совецкага народа.

Велізарнейшым трыумфам улады Советаў з'явіліся выбары Вярхоўнага Совета Саюза ССР і Вярхоўных Советаў саюзных і аўтаномных рэспублік. Выбары паказалі ўсяму свету, што ў нашай краіне дзве вялікія сілы — народ і комунізм—аб'ядналіся ў адно цэлае. Увесь совецкі народ яшчэ шчыльней згуртаваўся вакол партыі большэвікоў, вакол любімага друга, настаўніка і правадыра народаў — таварыша Сталіна.

Стаханаўскі рух, аб якім па-бацькоўску клапоціцца партыя, асабіста таварыш Сталін, шырыцца з кожным днём. Новыя дзесяткі і сотні рабочых ударнікаў, у дасканаласці авалодаўшы тэхнікай, сталі стаханаўцамі.

Самай выдатнай нашай перамогай з'яўляецца разгром трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай банды шпіёнаў, шкоднікаў і забойц. Няўхільна ўзнімаючы пад кіраўніцтвам партыі сваю рэвалюцыйную пільнасць, мы і ў далейшым усімі сіламі будзем дапамагаць слаўнай совецкай разведцы выкрываць і знішчаць гэтых шалёных сабак.

Разам з усімі брацкімі рэспублікамі, наша Совецкая Беларусь падыходзіць да ўрачыстага свята — XXI гадавіны Кастрычніка—з вялікімі поспехамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтых поспехаў мы дасягнулі дзякуючы штодзённым клопатам аб беларускім народзе сталінскага Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, дзякуючы няўхільнаму ажыццяўленню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Новых поспехаў дабілася ў гэтым годзе соцыялістычная прамысловасць рэспублікі. На многіх прадпрыемствах асвоен выраб новых станкоў і машын, выраслі рады стаханаўцаў.

На соцыялістычных палях багаты ўраджай сабрала сёлета калгаснае сялянства Совецкай Беларусі. Бесперапынна паляпшаецца матэрыяльна-бытавое становішча працоўных горада і вёскі. Пабудаваны дзесяткі новых сталінскіх школ, дамоў соцкультуры, больніц, ясляў, радзільных дамоў. Усё больш заможным і радасным становіцца жыццё рабочых і сялян.

Зараз па ўсёй краіне разгарнулася шырокая падрыхтоўка да сустрэчы XXI гадавіны Кастрычніка. Набліжэнне ўрачыстага дня—7-га лістапада—выклікае новы прыліў энтузіязма сярод працоўных краіны соцыялізма. Свае пачуцці гарачых совецкіх патрыётаў кожны працоўны імкнецца выказаць выдатнай стаханаўскай работай на заводах, фабрыках, калгасных палях, за станком, трактарам, камбайнам.

Дастойна сустрэць вялікае свята, — гэта значыць поўнасцю ліквідаваць сваю запазычанасць перад краінай, выканаць і перавыканаць вытворчыя праграмы, прыняць рашучыя меры да неадкладнай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, нястомна і да канца выкарчоўваць астаткі трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай нечысці з нашых прадпрыемстваў, з усіх куткоў совецкай зямлі, зрабіць усё неабходнае для ўкаранення стаханаўскіх метадаў работы, для ператварэння цэлых цэхаў, прадпрыемстваў у суцэльна стаханаўскія, шырока арганізуючы перадачу вопыта лепшых стаханаўцаў астатнім рабочым.

Мы, стаханаўцы, ударнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі, усе рабочыя і служачыя менскага станкабудаўнічага завода імя Сергея Міронавіча Кірава, уступаючы ў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, бяром на сябе наступныя абавязацельствы:

Выканаць гадавы план па заводу ў цэлым, у грашовым выражэнні і ў прадугледжаным асартыменце да 12 снежня — гадавіны выбараў Вярхоўнага Совета СССР.

Да дня вялікага ўсенароднага свята XXI гадавіны Кастрычніка — 7 лістапада — закончыць выкананне гадавой праграмы па кузнечнаму цэху.

Па новамеханічнаму цэху асвоіць вытворчасць 710-міліметравай гідраўлічнай пілы, дваццацітоннага працяжнога гідраўлічнага станка і поўнасцю выканаць гадавую праграму па нажовачных станках (350 штук) і дзесяцітонных працяжных гідраўлічных (30 штук). Гайканаразных станкоў замест 80 па плану выпусціць 89, гідраўлічных 300 м/м піл замест 40 выпусціць 41 і т. д.

Па цэху шырспажыва да 12 снежня даць звыш плана прадукцыі шырокага спажывання на 225 тысяч рублёў.

Мы бяром на сябе абавязацельства выпускаць прадукцыю выключна высокай якасці, па ўстаноўленых чарцяжах і нарматывах; шырока ўкараняць стаханаўскія метады работы. Арганізаваць перадачу вопыта і дапамогу лепшых стаханаўцаў завода астатнім рабочым, ахапіць усіх рабочых тэхвучобай, добра паставіць работу вытворчых нарад, узорна і своечасова падрыхтаваць завод, дамы рабочых і інтэрнаты да зімы.

Умацаваць абаронную работу сярод рабочых завода. Падрыхтаваць варашылаўскіх стралкоў 30 чалавек, значкістаў ППХА — 300 чалавек, кулямётчыкаў 1-ай ступені—20 чалавек.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, мы заклікаем стаханаўцаў і ўдарнікаў, усіх рабочых і работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрык, заводаў, членаў прамысловых арцеляў Совецкай Беларусі пачаць соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу вялікага свята.

Таварышы кіраўнікі партыйных арганізацый, гаспадарнікі і інжынерна-тэхнічныя работнікі!

Стварыце ўсе неабходныя ўмовы для авалодання стаханаўскімі метадамі работы ўсёй масай рабочых, дапамажыце рабочым, работніцам выканаць узятыя імі самаабавязацельствы па дастойнай сустрэчы XXI гадавіны Кастрычніка, змагайцеся за ператварэнне кожнага цэха, прадпрыемства ў суцэльна-стаханаўскія. Узначальце вялікі народны рух энтузіястаў соцыялістычнай прадукцыйнасці працы.

Таварышы тарфянікі і тарфяніцы! На тарфяных палях ляжаць яшчэ зараз не ўбранымі сотні і тысячы тон здабытага торфу. Ад вашай інтэнсіўнай работы будзе залежаць нармальная работа электрастанцый і ўсёй прамысловасці рэспублікі. Ваш свяшчэнны абавязак — напружыць усе свае сілы, усю сваю энергію і ўбраць і захаваць да адной цаглінкі торф, забяспечыўшы высокаякасным палівам нашы соцыялістычныя прадпрыемствы.

Таварышы рабочыя электрастанцый Менска, Гомеля, БелДРЭС'а імя Сталіна! Па віне электрастанцый штодзённа прастайваюць дзесяткі фабрык і заводаў. Вы абавязаны ў самы кароткі тэрмін наладзіць узорную работу сваіх прадпрыемстваў. Закончыць рамонт абсталявання, узорна падрыхтавацца да асенне-зімовага максімума. Чотка арганізуйце сваю работу, рашуча змагайцеся за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, не дапускайце ні адной аварыі.

Таварышы будаўнікі! Дзяржава адпусціла мільёны рублёў на будаўніцтва новых прадпрыемстваў, цэхаў, жыллёвых дамоў для рабочых, культурна-бытавых устаноў і т. д. Але з-за дрэннай арганізацыі працы, шматлікіх непаладак на будаўніцтве, гэтыя сродкі поўнасцю не асвойваюцца, неэканомна расходуюцца. Ваш абавязак—узмацніць тэмпы сваёй работы, наладзіць высокапрадукцыйную стаханаўскую работу на кожным будаўніцтве.

Таварышы чыгуначнікі, рабочыя водзнага транспарта! Уключайцеся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, дабіцеся ўзорнай падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду кожнага дэпо, паравоза, кожнай станцыі і дыстанцыі. Таварышы воднікі, арганізуйце ўзорную стаханаўскую работу на асенніх перавозках, шырэй укараняйце метады пагрузкі выдатнага стаханаўца тав. Блідмана, узорна падрыхтуйцеся да зімовага рамонту суднаў.

Таварышы рабочыя лясной прамысловасці! Спаборнічайце на хутчэйшую ліквідацыю адставання лесазагатовак і лесавывазкі, дабівайцеся ўзорнай падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду. Змагайцеся за безумоўнае і поўнае выкананне дзяржаўных планаў. Таварышы кіраўнікі леспрамгасаў, лесаўчасткаў, майстры лесу, памятайце, што ўсё рашаюць кадры. Стварыце сталыя кадры рабочых, забяспечце ім добрыя жыллёва-бытавыя ўмовы, прыміце ўсе меры для рамонту дарог, аўтатрактарнага парка і сканчэння ў тэрмін будаўніцтва лясных складаў.

Рабочыя і работніцы швейных, мэблевых, трыкатажных і іншых прадпрыемстваў і цэхаў, выробляючых прадметы шырокага спажывання!

На вас партыя і ўрад усклалі выключна адказную і ганаровую задачу: даць совецкаму спажыўцу як мага больш высокаякасных прадметаў шырспажыва. Ваш свяшчэнны абавязак выканаць гэтыя задачы. Дабіцеся поўнага выканання і перавыканання планаў вырабу прадметаў шырокага спажывання: вопраткі, мэблі, трыкатажу, металавырабаў, гэчаў хатняга ўжытку і т. д., узнімайце якасць і ўдзешаўляйце прадукцыю, ліквідуйце брак, выкарыстоўвайце ўсе рэзервы, пашырайце стаханаўскі рух.

Таварышы рабочыя і работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя! Дастойна сустрэнем XXI гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Уславім нашу дарагую радзіму новымі стаханаўскімі перамогамі, будзем няўхільна мацаваць абаронную магутнасць краіны соцыялізма.

Няхай жыве наша слаўная радзіма—вялікі СССР!

Няхай жыве наша родная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве і мацнее стаханаўскі рух!

Няхай жыве наш любімы друг і настаўнік, правадыр народаў — вялікі Сталін!

ПА ДАРУЧЭННЮ АГУЛЬНАГА СХОДА РАБОЧЫХ МЕНСКАГА СТАНКАБУДАЎНІЧАГА ЗАВОДА ІМЯ КІРАВА АДОЗВУ ПАДПІСАЛІ:

І. Н. ДРАБЫШЭЎСКІ — дырэктар завода, КАЦОВІЧ — сакратар парткома, Г. ЛАПІДУС — старшыня заўкома, стаханаўцы — П. С. РУДЫ, М. І. ЗАГОРЫНА, А. Я. ШАЛІМА, А. Ф. БАЙДАК, П. І. АХРЭМЧЫК, В. А. ЦЕРАХАЎ, М. Я. ГАРДЗІЕНКА, Я. М. ЧАРНОЎ, С. А. МЕСЕЛЬ, Я. Л. ЛАПІДУС.

ГІСТОРЫЯ
Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). КАРОТКІ КУРС. *Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год.*

РАЗДЗЕЛ V

ПАРТЫЯ БОЛЬШЭВІКОЎ У ГОДЫ ЎЗДЫМУ РАБОЧАГА РУХУ ПЕРАД ПЕРШАЙ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНОЙ. (1912 — 1914 ГОДЫ).

1. УЗДЫМ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ У 1912—1914 ГОДАХ.

Таржаство сталыпінскай рэакцыі аказалася нядоўгавечным. Не мог быць моцным урад, які не хацеў даць народу нічога, апрача бізуна і шыбеніц. Рэпрэсіі сталі такімі звычайнымі, што яны перасталі палохаць народ. Стала знікаць стомленасць рабочых, навеяная ў першыя годы паражэння рэвалюцыі. Рабочыя зноў пачалі падымацца на барацьбу. Прадбачанне большэвікоў аб няўхільнасці новага рэвалюцыйнага ўздыму аказалася правільным. Ужо ў 1911 годзе колькасць стачачнікаў перавышала 100 тысяч, тады як у папярэднія годы яна складала ўсяго 50—60 тысяч чалавек. Яшчэ Пражская партыйная канферэнцыя ў студзені 1912 года адзначыла ажыўленне, якое пачалося ў рабочым руху. Але сапраўдны ўздым рэвалюцыйнага руху пачынаецца ў красавіку—маі 1912 года, калі ўспыхнулі масавыя палітычныя стачкі ў сувязі з ленскім расстрэлам рабочых.

4 красавіка 1912 года на Ленскіх залатых прыісках у Сібіры ў часе стачкі па загаду царскага жандарскага афіцэра было забіта і ранена больш 500 рабочых. Расстрэл бязбройнага натоўпу ленскіх шахцёраў, якія мірна ішлі для перагавораў з адміністрацыяй, усхваляваў усю краіну. Гэтае новае крывавае зладзеянне царскага самадзяржаўя было ўчынена ва ўгоду гаспадарам Ленскіх залатых прыскаў —англійскім капіталістам, каб зламаць эканамічную забастоўку шахцёраў. Англійскія капіталісты і іх рускія кампаньёны атрымлівалі ад Ленскіх прыскаў шалёныя прыбыткі — штогод больш 7 мільёнаў рублёў—за кошт самай бессаромнай эксплаатацыі рабочых. Яны плацілі рабочым мізэрную заработную плату, кармілі іх нягоднымі, гнілымі прадуктамі. Не вытрымаўшы прыцясненняў і здзекаў, 6 тысяч рабочых Ленскіх прыскаў забаставалі.

На ленскі расстрэл пролетарыят адказаў масавымі забастоўкамі, дэманстрацыямі і мітынгамі ў Пецербургу, Маскве, ва ўсіх прамысловых цэнтрах і раёнах.

«Мы былі так ашаломлены і ўзрушаны, што адразу не знаходзілі падыходзячых слоў. Які-б пратэст мы ні заявілі, гэта было-б слабым цэнем таго душэўнага клакатання, якое кожны з нас перажываў. Нішто нам не дапаможа: ні слёзы, ні пратэсты, а толькі арганізаваная масавая барацьба», — так пісалі рабочыя адной групы прадпрыемстваў у сваёй рэзалюцыі.

Вялікае абурэнне рабочых яшчэ больш узмацнілася, калі царскі міністр Макараў у адказ на запрос социял-дэмакратычнай фракцыі ў Дзяржаўнай думе па поваду ленскага расстрэлу нагла заявіў: «Так было і так будзе!». Колькасць удзельнікаў палітычных стачак пратэсту супроць крывавага збівання ленскіх рабочых вырасла да 300 тысяч.

Ленскія дні, нібы ураган, уварваліся ў тую атмасферу «супакаення», якая была створана сталыпінскім рэжымам.

Вось што пісаў па гэтаму поваду т. Сталін у большэвіцкай пецербургскай газеце «Звезда» ў 1912 годзе:

«Ленскія выстралы разбілі лёд маўчання, і—рушыла рака народнага руху. Рушыла!.. Усё, што было злога і згубнага ў сучасным рэжыме, усё, чым хварэла многапакутная Расія — усё гэта сабралася ў адным факце, у падзеях на Лене. Вось чаму іменна ленскія выстралы паслужылі сігналам забастовак і дэманстрацый».

Дарэмна ліквідатары і трацкісты хавалі рэвалюцыю. Ленскія падзеі паказалі, што рэвалюцыйныя сілы жывуць, што ў рабочым класе накапілася велізарная маса рэвалюцыйнай энергіі. Першамайскія забастоўкі 1912 года ахапілі каля 400 тысяч рабочых. Стачкі гэтыя насілі яркі палітычны характар, праходзілі пад большэвіцкімі рэвалюцыйнымі лозунгамі: дэмакратычная рэспубліка, 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыя ўсёй памешчыцкай зямлі. Гэтыя асноўныя лозунгі былі разлічаны на тое, каб аб'ядноўваць не толькі шырокія масы рабочых, але і сялян і салдат для рэвалюцыйнага націску супроць самадзяржаўя.

«Грандыёзная майская забастоўка ўсерасійскага пролетарыята і звязаныя з ёю вулічныя дэманстрацыі, рэвалюцыйныя пракламацыі і рэвалюцыйныя прамовы перад натоўпамі рабочых ясна паказалі, што Расія ўступіла ў паласу рэвалюцыйнага ўздыму», — пісаў Ленін у артыкуле «Рэвалюцыйны ўздым» (**Ленін**, т. XV, стар. 533).

Устрывожаныя рэвалюцыйнасцю рабочых, ліквідатары выступілі супроць стачачнай барацьбы, называючы яе «стачачным азартам». Рэвалюцыйную барацьбу пролетарыята ліквідатары і іх саюзнік Троцкі хацелі падмяніць «петыцыйнай кампаніяй». Рабочым прапаноўвалася падпісаць паперку, «петыцыю», з просьбай аб «правах» (аб адмене абмежаванняў саюзаў, стачак і т. п.), каб потым гэту паперку накіраваць у Дзяржаўную думу. Ліквідатарам удалося сабраць толькі 1.300 подпісаў, у той час як вакол рэвалюцыйных лозунгаў выстаўленых большэвікамі, згуртаваліся сотні тысяч рабочых.

Рабочы клас ішоў па шляху, указанаму большэвікамі.

Эканамічная абстаноўка ў краіне ў гэты перыяд прадстаўляла наступную карціну.

Прамысловы застой ужо ў 1910 годзе змяняўся ажыўленнем, расшырэннем вытворчасці ў асноўных галінах прамысловасці. Калі выплаўка чыгуну ў 1910 годзе складала 186 мільёнаў пудоў, а ў 1912 годзе—256, то ў 1913 годзе складала 283 мільёны пудоў. Выпрацоўка каменнага вугалю ў 1910 годзе была роўна 1.522 мільёнам пудоў, а ў 1913 годзе—ужо 2.214 мільёнам пудоў.

Адначасова з ростам капіталістычнай прамысловасці ішоў быстры рост пролетарыята. Асаблівасцю развіцця прамысловасці з'яўлялася далейшая канцэнтрацыя вытворчасці на буйных і буйнейшых прадпрыемствах. Калі ў 1901 годзе на буйных прадпрыемствах з колькасцю 500 і вышэй рабочых працавала 46,7 проц. усёй колькасці рабочых, то ў 1910 годзе на прадпрыемствах такога тыпу працавала ўжо каля 54 проц., гэта значыць, больш палавіны ўсіх рабочых. Гэта была небывалая канцэнтрацыя прамысловасці. Нават у такой развітай прамысловай краіне, як Паўночная Амерыка, у гэты час на буйных прадпрыемствах працавала толькі каля трэці ўсіх рабочых.

Рост і канцэнтраванасць пролетарыята на буйных прадпрыемствах, пры наяўнасці такой рэвалюцыйнай партыі, як партыя большэвікоў, ператваралі рабочы клас Расіі ў найвялікшую сілу палітычнага жыцця краіны. Варварскія формы эксплаатацыі рабочых на прадпрыемствах у спалучэнні з нясцерпным паліцэйскім рэжымам царскіх апрычнікаў надавалі кожнай сур'ёзнай стачцы палітычны характар. Перапляценне-ж эканамічнай і палітычнай барацьбы надавала масавым стачкам асобую рэвалюцыйную сілу.

У авангардзе рэвалюцыйнага рабочага руху ішоў гераічны пролетарыят Пецербурга, за Пецербургам ішлі Прыбалтыйскі край, Масква і Маскоўская губерня, затым Паваложжа і поўдзень Расіі. У 1913 годзе рух ахапляе Заходні край, Польшчу, Каўказ. Усяго ў 1912 годзе баставала па афіцыяльных справаздачах 725 тысяч, а па іншых больш поўных даных — звыш мільёна рабочых, у 1913 годзе па афіцыяльных справаздачах — 861 тысяча, а па больш поўных даных — 1.272 тысячы. У першай палавіне 1914 года прымала ўдзел у стачках ужо каля паўтара мільёнаў рабочых.

Такім чынам рэвалюцыйны ўздым 1912—1914 годаў, размах стачачнага руху набліжалі краіну да абстаноўкі пачатку рэвалюцыі 1905 года.

Рэвалюцыйныя масавыя стачкі пролетарыята мелі **агульнанароднае** значэнне. Яны былі накіраваны супроць самадзяржаўя. Стачкі сустракалі спачуванне велізарнай большасці працоўнага насельніцтва. Фабрыканты і заводчыкі помсцілі рабочым за забастоўкі лакаутамі. У 1913 годзе ў Маскоўскай губерні капіталісты выкінулі на вуліцу 50 тысяч тэкстыльшчыкаў. У сакавіку 1914 года у Пецербургу ў адзін дзень было звольнена 70 тысяч рабочых. Рабочыя іншых прадпрыемстваў і галін прамысловасці дапамагалі таварышам якія забаставалі і падвергліся лакауту, масавымі грашовымі зборамі, а часам забастоўкамі салідарнасці.

Уздым рабочага руху і масавыя стачкі будзілі і ўцягвалі ў барацьбу таксама сялянскія масы. Сяляне зноў падымаліся на барацьбу супроць памешчыкаў, энішчалі памешчыцкія маёнткі і кулацкія хутары. За 1910—1914 годы адбылося звыш 13 тысяч сялянскіх выступленняў.

Пачаліся рэвалюцыйныя выступленні і ў войсках. У 1912 годзе адбылося ўзброенае выступленне сярод войск у Туркестане. Паспявалі паўстанні ў Балтыйскім флоце і Севастопалі.

Рэвалюцыйны стачачны рух і дэманстрацыі, кіруемыя большэвіцкай партыяй, паказвалі, што рабочы клас вядзе барацьбу не за частковыя патрабаванні, не за «рэформы», а за вызваленне народа ад царызма. Краіна ішла насустрач новай рэвалюцыі.

Для таго, каб быць бліжэй да Расіі, Ленін пераехаў з Парыжа летам 1912 года ў Галіцыю (былая Аўстрыя). Тут пад яго старшынствам адбыліся дзве нарады членаў ЦК і адказных работнікаў: адна—ў Кракаве ў канцы 1912 года і другая — восенню 1913 года ў мястэчку Пароніно, каля Кракава. На гэтых нарадах былі прыняты рашэнні па важнейшых пытаннях рабочага руху: аб рэвалюцыйным уздыме, аб стачках і задачах партыі, аб умацаванні нелегальных арганізацый, аб думскай социял-дэмакратычнай фракцыі, аб партыйнай прэсе, аб страхавой кампаніі.

2. БОЛЬШЭВІЦКАЯ ГАЗЕТА „ПРАВДА". БОЛЬШЭВІЦКАЯ ФРАКЦЫЯ Ў IV ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ.

Магутнай зброяй у руках большэвіцкай партыі ў справе ўмацавання сваіх арганізацый і заваявання ўплыву ў масах з'явілася штодзённая большэвіцкая газета «Правда», якая выдавалася ў Пецербургу. Яна была аснована, згодна ўказанню Леніна, па ініцыятыве Сталіна, Ольмінскага і Палетаева. Масавая рабочая газета «Правда» нарадзілася разам з новым уздымам рэвалюцыйнага руху. 22 красавіка (5 мая па новаму стылю) 1912 года вышаў яе першы нумар. Гэта было сапраўдным святам для рабочых. У гонар паяўлення «Правды» было рашана лічыць 5 мая днём свята рабочага друку.

Яшчэ да «Правды» выходзіла штотыднёвая большэвіцкая газета «Звезда», прызначаная для перадавых рабочых. «Звезда» адыграла вялікую ролю ў ленскія дні. У ёй быў змешчан рад баявых палітычных артыкулаў Леніна і Сталіна, якія мабілізавалі рабочы клас на барацьбу. Але ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму штотыднёвай газеты для большэвіцкай партыі было ўжо недастаткова. Патрэбна была штодзённая масавая палітычная газета, разлічаная на самыя шырокія слаі рабочых. Такой газетай і была «Правда».

У гэты перыяд роля «Правды» была выключна вялікая. «Правда» заваёўвала на старану большэвізма шырокія масы рабочага класа. У абстаноўцы безупынных паліцэйскіх праследаванняў штрафаў, канфіскацый за змяшчэнне якія не спадабаліся цэнзуры, артыкулаў і карэспандэнцый «Правда» магла існаваць толькі пры актыўным падтрыманні дзесяткаў тысяч перадавых рабочых. Велізарныя грашовыя штрафы маглі выплачвацца «Правдой» толькі дзякуючы шырокім зборам сярод рабочых. Нярэдка значная частка тыража канфіскаваных нумароў «Правды» ўсё-ж пападала да чытача, бо перадавыя рабочыя яшчэ з ночы прыходзілі ў друкарню і выносілі з сабой пачкі газет.

Царскі ўрад за два з палавінай гады восем разоў закрываў «Праўду», але пры падтрыманні рабочых яна зноў пачынала выходзіць пад новай сходнай назвай, напрыклад — «За правду», «Путь правды», «Трудовая правда».

У той час, як «Правда» разыходзілася ў сярэднім па 40 тысяч экземпляраў у дзень, тыраж меншавіцкай штодзённай газеты «Луч» не перавышаў 15—16 тысяч.

Рабочыя лічылі «Правду» сваёй рабочай газетай, адносіліся да яе з вялікім давер'ем і чутка прыслухоўваліся да яе голасу. Кожны экземпляр «Правды», пераходзячы з рук у рукі, абслугоўваў дзесяткі чытачоў, фарміраваў іх класавае сазнанне, выхоўваў, арганізоўваў, клікаў на барацьбу.

Аб чым пісала «Правда»?

У кожным нумары «Правды» змяшчаліся дзесяткі карэспандэнцый рабочых, у якіх апісвалася рабочае жыццё, зверская эксплаатацыя, розныя прыцясненні і здзекванні капіталістаў, іх упраўляючых і майстраў над рабочымі. Гэта былі вострыя меткія выкрыванні капіталістычных парадкаў. Нярэдка ў заметках «Правды» паведамлялася аб самагубствах галадаючых беспрацоўных, страціўшых надзею знайсці работу.

«Правда» пісала аб нуждах і патрабаваннях рабочых розных фабрык і галін прамысловасці, пісала, як рабочыя змагаюцца за свае патрабаванні. Амаль у кожным нумары пісалася аб стачках на розных прадпрыемствах. Калі адбываліся буйныя, працяглыя стачкі, газета арганізоўвала рабочых іншых прадпрыемстваў і галін прамысловасці для дапамогі стачачнікам сваімі зборамі. Часам у стачачныя фонды збіраліся дзесяткі тысяч рублёў—велізарныя па таму часу сумы, калі прыняць пад увагу, што большасць рабочых атрымлівала ўсяго па 70—80 капеек у дзень. Гэта выхоўвала рабочых у духу пролетарскай салідарнасці і сазнання адзінства інтарэсаў усіх рабочых.

На кожную палітычную падзею, на кожную перамогу або паражэнне рабочыя адклікаліся прысылкай у «Праўду» пісьмаў, прывітанняў, пратэстаў і т. д. У сваіх артыкулах «Правда» асвятляла задачы рабочага руху з пасляслядоўнага большэвіцкага пункту гледжання. Легальная газета не магла прама заклікаць да звяржэння царызма. Прыходзілася пісаць намёкамі, якія добра разумелі свядомыя рабочыя і растлумачвалі масам. Калі, напрыклад, у «Правде» пісалася аб «поўных і няўрэзаных патрабаваннях пятага года», рабочыя разумелі, што гутарка ідзе аб рэвалюцыйных лозунгах большэвікоў—аб лозунгах за звяржэнне царызма, за дэмакратычную рэспубліку, за канфіскацыю памешчыцкай зямлі, за 8-гадзінны рабочы дзень.

«Правда» арганізавала перадавых рабочых напярэдадні выбараў у IV думу. Яна выкрывала прэдацельскую пазіцыю староннікаў пагаднення з ліберальнай буржуазіяй, староннікаў «сталыпінскай рабочай партыі» — меншавікоў. «Правда» заклікала рабочых галасаваць за староннікаў «няўрэзаных патрабаванняў пятага года», гэта значыць за большэвікоў. Выбары былі многаступенныя. Спачатку на сходах рабочых выбіралі ўпаўнаважаных, потым ўпаўнаважаныя выбіралі выбаршчыкаў, а ўжо выбаршчыкі прымалі ўдзел у выбарах рабочага дэпутата ў думу. У дзень выбараў «Правда» апублікавала спіс выбаршчыкаў-большэвікоў, за які рэкамендавала галасаваць рабочым. Апублікаваць загадзя гэты спіс нельга было, каб не падвергнуць намечаных кандыдатаў небяспецы арышту.

«Правда» дапамагала арганізаваць выступленні пролетарыята. У момант вялікага лакаута ў Пецербургу вясной 1914 года, калі немэтазгодна было абвяшчаць масавую стачку, «Правда» заклікала рабочых да іншых форм барацьбы — да масавых мітынгаў на заводах, да дэманстрацый на вуліцы. Прама пісаць аб гэтым у газеце нельга было. Але гэты заклік быў зразумелы свядомым рабочым, якія чыталі артыкул Леніна пад скромным загалоўкам «Аб формах рабочага руху», у якім гаварылася, што стачку ў даны момант трэба замяняць больш высокай формай рабочага руху, што азначала заклік да арганізацыі мітынгаў і дэманстрацый.

Так ажыццяўлялася спалучэнне нелегальнай рэвалюцыйнай дзейнасці большэвікоў з легальнай агітацыяй і арганізацыяй рабочых мас праз «Правду».

«Правда» пісала не толькі аб рабочым жыцці, аб рабочых стачках і дэманстрацыях. «Правда» сістэматычна асвятляла сялянскае жыццё, галадоўкі сялянства, эксплаатацыю сялян прыгоннікамі-памешчыкамі, аграбленне лепшай сялянскай зямлі кулакамі-хутаранамі ў рэзультаце сталыпінскай «рэформы». «Правда» паказвала свядомым рабочым, як многа гаручага матэрыялу накапілася ў вёсцы. «Правда» вучыла пролетарыят, што задачы рэвалюцыі 1905 года не выраішаны, што прадстаіць новая рэвалюцыя. «Правда» вучыла, што ў гэтай другой рэвалюцыі пролетарыят павінен выступіць сапраўдным правадыром, кіраўніком народа, што ён будзе мець у гэтай рэвалюцыі такога моцнага саюзніка, як рэвалюцыйнае сялянства.

Меншавікі дабіваліся таго, каб пролетарыят кінуў думаць аб рэвалюцыі. Меншавікі ўнушалі рабочым: кіньце думаць аб народзе, аб галадоўках сялян, аб панаванні чорнасоценных памешчыкаў-прыгоннікаў, змагайцеся толькі за «свабоду кааліцый», падавайце аб гэтым «петыцыі» царскаму ўраду. Большэвікі растлумачвалі рабочым, што гэтая меншавіцкая прапаведзь адмовы ад рэвалюцыі, адмовы ад саюза з сялянствам вядзецца ў інтарэсах буржуазіі, што рабочыя наверняка перамогуць царызм, калі яны прыцягнуць на свой бок сялянства, як свайго саюзніка, што дурныя пастыры, нажшталт меншавікоў, павінны быць адкінуты прэч, як ворагі рэвалюцыі.

Аб чым пісала «Правда» ў аддзеле «Сялянскае жыццё»?

Возьмем для прыкладу некалькі карэспандэнцый за 1913 год.

Карэспандэнцыя пад загалоўкам «Аграрная справа» паведамляла з Самары, што з 45 сялян сяла Новахасбулата Бугульмінскага павета, абвінавачваемых у супраціўленні землямеру пры выдзяленні адрубшчыкам грамадскай зямлі, значная частка прыгаворана да доўгага турэмнага зняволення.

Кароценькая карэспандэнцыя з Пскоўскай губерні паведамляла: «Сяляне сяла Псіца (паблізу станцыі Завалле) аказалі ўзброенае супраціўленне стражнікам. Есць раненыя. Прычына сутычкі — аграрныя непаразуменні. У Псіцу сцягнуты стражнікі; туды-ж выехалі віцэ-губернатар і пракурор».

Карэспандэнцыя з Уфімскай губерні паведамляла аб распродажы сялянскіх надзелаў, аб тым, што голад і закон аб выхадзе з сельскай абшчыны ўзмацнілі працэс абезэямелення сялян. Вось хутар Барысаўка. Тут 27 дамоў, якія ўладаюць 543 дзесяцінамі ворыўнай зямлі. За час голаду 5 домагаспадароў прадалі ў вечнасць 31 дзес. па 25—33 руб. за дзесяціну, а зямля каштуе разы ў 3—4 даражэй. Тут-жа 7 дамоў заклалі 177 дзес., атрымаўшы па 18—20 руб за дзесяціну на 6 год па 12 проц. у год. Калі прыняць пад увагу абнішчаласць насельніцтва і шалёныя процанты, то з упэўненасцю можна сказаць: з 177 дзесяцін палавіна павінна перайсці ў рукі ліхвяра, бо такую велізарную суму на працягу 6 год наўрад ці зможа выплаціць і палавіна даўжнікоў.

У сваім артыкуле «Буйнае памешчыцкае і дробнае сялянскае землеўладанне ў Расіі», апублікаваным у «Правде», Ленін наглядна паказваў рабочым і сялянам, якія велізарныя зямельныя багацці знаходзяцца ў руках паразітаў-памешчыкаў. Толькі ў 30 тысяч буйнейшых памешчыкаў было каля 70 мільёнаў дзесяцін зямлі. Столькі-ж зямлі прыпадала на долю 10 мільёнаў сялянскіх двароў. На кожнага буйнага памешчыка ў сярэднім прыпадала па 2.300 дзесяцін, на кожны сялянскі двор, лічачы і кулацкія двары, — у сярэднім 7 дзесяцін, пры гэтым 5 мільёнаў маламоцных сялянскіх двароў, гэта значыць палавіна ўсяго сялянства, мелі на двор не больш адной-двух дзесяцін зямлі. Гэтыя факты наглядна паказвалі, што корань сялянскай галечы і галадовак ляжыць у буйным памешчыцкім землеўладанні, у перажытках прыгонніцтва, ад якіх сялянства можа вызваліцца толькі праз рэвалюцыю, кіруемую рабочым класам.

Праз рабочых, звязаных з вёскай, «Правда» пранікала ў вёску, прабуджаючы да рэвалюцыйнай барацьбы перадавых сялян.

У перыяд стварэння «Правды» нелегальныя социял-дэмакратычныя арганізацыі знаходзіліся цалкам у руках большэвікоў. Легальныя-ж формы арганізацыі — думская фракцыя, друк, страхавыя касы, профсаюзы — не былі яшчэ цалкам адваяваны ў меншавікоў. Патрэбна была рашучая барацьба большэвікоў за выгнанне ліквідатараў з легальных арганізацый рабочага класа. Гэтая барацьба ўвянчалася поспехам, дзякуючы «Правде».

«Правда» стаяла ў цэнтры барацьбы за партыйнасць, за ўзнаўленне **масавай** рабочай рэвалюцыйнай партыі. «Правда» згуртоўвала легальныя арганізацыі вакол падпольных ачагоў большэвіцкай партыі і накіроўвала рабочы рух да адной поўнай мэты — да падрыхтоўкі рэвалюцыі.

У «Правды» была велізарная колькасць рабочых карэспандэнтаў. Толькі за адзін год у ёй было надрукавана звыш 11 тысяч рабочых карэспандэнцый. Але «Правда» звязвалася з рабочымі масамі не толькі шляхам пісьмаў і карэспандэнцый. Шматлікія рабочыя з прадпрыемстваў кожны дзень заходзілі ў рэдакцыю. У рэдакцыі «Правды» была сканцэнтравана значная частка арганізацыйнай работы партыі. Тут наладжваліся сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовых партыйных ячэек, сюды прыходзілі весткі аб партыйнай рабоце на фабрыках і заводах, адсюль перадаваліся партыйныя дырэктывы Пецербургскага камітэта і Цэнтральнага Камітэта партыі.

У рэзультаце двух з палавінай год упорнай барацьбы з ліквідатарамі, за ўзнаўленне масавай рэвалюцыйнай рабочай партыі большэвікі дабіліся таго, што к лету 1914 года за большэвіцкай партыяй, за «праўдысцкай» тактыкай ішло **чатыры пятых** актыўных рабочых Расіі. Аб гэтым гаварыў, напрыклад, той факт, што з агульнай колькасці 7 тысяч рабочых груп, якія рабілі ў 1914 годзе зборы на рабочыя газеты, 5.600 груп збіралі грошы на большэвіцкі друк і толькі 1.400 груп — на меншавіцкі. У меншавікоў затое было многа «багатых прыяцеляў» з ліберальнай буржуазіі і буржуазнай інтэлігенцыі, якія давалі больш палавіны сродкаў, неабходных на ўтрыманне меншавіцкай газеты.

Большэвікоў тады называлі «праўдзістамі». З «Правдой» расло цэлае пакаленне рэвалюцыйнага пролетарыята, якое правяло потым Кастрычніцкую социялістычную рэвалюцыю. За «Правдой» стаялі дзесяткі і сотні тысяч рабочых. У годы рэвалюцыйнага ўздыму (1912—1914) быў закладзен моцны фундамент масавай большэвіцкай партыі, якога не маглі разбурыць ніякія праследаванні царызма ў перыяд імперыялістычнай вайны.

«Правда» 1912 года—гэта закладка фундамента для перамогі большэвізма ў 1917 годзе». (**Сталін**).

Другім агульнарасійскім легальным органам партыі была большэвіцкая фракцыя ў IV Дзяржаўнай думе.

У 1912 годзе ўрад назначыў выбары ў IV думу. Удзелу ў выбарах наша партыя надавала вялікае значэнне. Думская социял-дэмакратычная фракцыя і газета «Правда» з'яўляліся асноўнымі апорнымі легальнымі пунктамі агульнарасійскага маштабу, пр якія большэвіцкая партыя праводзіла сваю рэвалюцыйную работу ў масах.

Большэвіцкая партыя выступіла в выбарах у думу самастойна, пад св імі ўласнымі лозунгамі, наносячы ўд ры адначасова і ўрадавым партыям ліберальнай буржуазіі (кадэтам). Вя барчую кампанію большэвікі вялі па лозунгамі дэмакратычнай рэспублі 8-гадзіннага рабочага дня, канфіск цыі памешчыцкай зямлі.

Выбары ў IV думу адбываліся в сенню 1912 года. У пачатку кастрычн ка ўрад, нездаволены ходам выбар у Пецербургу, прабаваў нарушыць в барчыя правы рабочых на радзе бу нейшых заводаў. У адказ на гэта П цербургскі камітэт нашай партыі, прапанове тав. Сталіна, заклікаў раб чых буйнейшых прадпрыемстваў аднадзённай забастоўкі. Пастаўлен ў затрудняльнае становішча, урад в мушан быў уступіць, і рабочыя сходах атрымалі магчымасць выбіра тых, каго хацелі. Рабочыя велізарна большасцю галасавалі за «Нака упаўнаважаным і дэпутату, складзен тав. Сталіным. «Наказ пецербургск рабочых свайму рабочаму дэпутат напамінаў аб нявырашаных задач 1905 года.

«... Мы думаем, — гаварылася «Наказе», — што Расія жыве нап рэдадні надыходзячых масавых р хаў, быць можа, больш глыбок чым ў пятым годзе... Застрэльшч кам гэтых рухаў будзе, як і ў пяты годзе, найбольш перадавы клас ру кага грамадства, рускі пролетарыя Саюзнікам-жа яго можа быць толь многапакутнае сялянства, кроўна з пікаўленае ў разняволенні Расіі».

«Наказ» заяўляў, што будучыя в ступленні народа павінны набыць фо му барацьбы на два фронты — як с проць царскага ўрада, так і супро ліберальнай буржуазіі, якая шукае п галднення з царызмам.

Ленін надаваў вялікае значэнне «Н казу», які заклікаў рабочых да рэв люцыйнай барацьбы. І рабочыя ў св рэзалюцыях адгукаліся на гэты закл

Большэвікі перамаглі на выбарах, ў думу ад рабочых Пецербурга б выбран тав. Бадаеў.

Рабочыя выбіралі ў думу асобна астатніх слаёў насельніцтва (так зв ная рабочая курыя). З дзевяці дэпут таў ад рабочай курыі шасць былі чл намі большэвіцкай партыі: Бадаеў, Пе роўскі, Муранаў, Самойлаў, Шагаў Маліноўскі (які потым аказаўся пр вакатарам). Большэвіцкія дэпута прайшлі ад буйнейшых прамыслов цэнтраў, у якіх налічвалася не ме 4/5 рабочага класа. Але некаторыя л рідатары былі выбраны не ад рабоч г. зн. не па рабочай курыі Таму думе аказалася 7 ліквідатараў супро 6 большэвікоў. Першапачаткова бол шэвікі і ліквідатары ўтварылі ў ду адну агульную социял-дэмакратычну фракцыю. Пасля ўпорнай барацьбы ліквідатарамі, якія перашкаджалі р волюцыйнай рабоце большэвікоў, дэп таты-большэвікі ў кастрычніку 1913 г да, па ўказанню ЦК большэвіцкай па тыі, выйшлі з аб'яднанай социял-дэм кратычнай фракцыі і ўтварылі сам стойную большэвіцкую фракцыю.

Большэвіцкія дэпутаты выступалі думе з рэвалюцыйнымі прамовамі, якіх выкрывалі самадзяржаўны ле рабілі запросы ўраду аб расправ з рабочымі, аб бесчалавечнай эксп атацыі рабочых капіталістамі.

Яны выступалі ў думе таксама аграрнаму пытанню, заклікалі ў св прамовах сялян да барацьбы супро прыгоннікаў - памешчыкаў, выкрыва кадэцкую партыю, якая стаяла супро канфіскацыі памешчыцкіх зямель і п радачы іх сялянам.

Большэвікі ўнеслі ў Дзяржаўную д му законапраект аб 8-гадзінным ра чым дні, які, вядома, не быў прын чорнасоценнай думай, але адыграў в лікую агітацыйную ролю.

Большэвіцкая фракцыя ў думе бы цесна звязана з ЦК партыі, з Ленін і атрымлівала ад яго ўказанні. Нег срэдна кіраваў ёю ў часе свайго пр бывання ў Пецербургу тав. Сталін.

Не абмяжоўваючыся работай у ду дэпутаты-большэвікі развілі вялік дзейнасць па-за думай. Яны выязж лі на фабрыкі і заводы, ездзілі па р бочых цэнтрах краіны з дакладамі, а ганізоўвалі тайныя сходы, на якіх ра лумачвалі рашэнні партыі, стваралі в выя партыйныя арганізацыі. Дэпута ўмела спалучалі легальную дзейнас з нелегальнай, падпольнай работай.

3. ПЕРАМОГА БОЛЬШЭВІКОЎ У ЛЕГАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ, ДАЛЕЙШЫ РОСТ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ. ПЯРЭДАДЗЕНЬ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.

Партыя большэвікоў паказала ў гэты перыяд узоры кіраўніцтва ўсімі формамі і праяўленнямі класавай барацьбы пролетарыята. Яна будавала падпольныя арганізацыі. Яна выдавала нелегальныя лістоўкі. Яна вяла тайную рэвалюцыйную работу ў масах. Разам з тым, яна ўсё больш авалодвала рознымі легальнымі арганізацыямі рабочага класа. Партыя імкнулася заваяваць прафесіянальныя саюзы, народныя дамы, вячэрнія універсітэты, клубы, страхавыя ўстановы. Гэтыя легальныя арганізацыі здаўна служылі прытулкам для ліквідатараў. Большэвікі павялі энергічную барацьбу за ператварэнне легальных таварыстваў у апорныя пункты нашай партыі. Умела спалучаючы нелегальную работу з легальнай, большэвікі заваявалі на сваю старану ў абодвух сталіцах большасць прафесіянальных аб'яднанняў. Асабліва бліскучую перамогу большэвікі атрымалі пры выбарах у 1913 годзе праўлення саюза металістаў у Пецербургу: на сходзе з 3 тысяч металістаў ледзь 150 чалавек галасавала за ліквідатараў.

Тое-ж самае трэба сказаць аб такой легальнай арганізацыі, як социял-дэмакратычная фракцыя ў IV Дзяржаўнай думе. Хоць у меншавікоў было ў думе 7 дэпутатаў, а ў большэвікоў 6 дэпутатаў, меншавіцкая сямёрка, якая прайшла галоўным чынам ад нерабочых раёнаў, прадстаўляла ледзь 1/5 частку рабочага класа, тады як большэвіцкая шасцёрка, якая прайшла з асноўных прамысловых цэнтраў краіны (Пецербург, Масква, Іванава-Вазнясенск, Кастрама, Екаперынаслаў, Харкаў), прадстаўляла больш 4/5 рабочага класа краіны. Рабочыя лічылі сваі дэпутатамі шасцёрку (Бадаеў, Петроўскі і інш.), а не сямёрку.

Большэвікам удалося заваяваць л гальныя арганізацыі таму, што ян не гледзячы на дзікія праследван царызма і траўлю з боку ліквідатара і трацкістаў, здолелі захаваць нел гальную партыю і цвёрдую дысцыпл ну ў сваіх радах, стойка абаранялі ін

(Працяг на 3 стар.).

ПРАЦЯГ.

арэсы рабочага класа, былі цесна звязаны з масамі і вялі непрымірымую барацьбу з ворагамі рабочага руху.

Такім чынам, перамога большэвікоў і паражэнне меншавікоў у легальных арганізацыях развіваліся па ўсёй лініі. Як у галіне агітацыі з думскай трыбуны, так і ў галіне рабочага руху і іншых легальных арганізацый меншавікі былі адкінуты на задні план. Ахоплены рэвалюцыйным рухам рабочы клас упэўнена і рашуча згуртоўваўся вакол большэвікоў, адкідаючы рэч меншавікоў.

У давяршэнне да ўсяго меншавікі аказаліся банкротамі ў галіне нацыянальнага пытання. Рэвалюцыйны рух на акраінах Расіі патрабаваў яснай праграмы па нацыянальнаму пытанню. Але ў меншавікоў не аказалася ніякай праграмы, калі не лічыць «культурную ўтапію» Бунда, якая нікога не магла задаволіць. Толькі ў большэвікоў аказалася марксісцкая праграма па нацыянальнаму пытанню, выкладзеная ў артыкуле таварыша Сталіна «Марксізм і нацыянальнае пытанне» і ў артыкулах Леніна «Аб праве нацый на самавызначэнне» і «Крытычныя заметкі па нацыянальнаму пытанню».

Не дзіўна, што пасля такіх паражэнняў меншавізма Жнівеньскі блок стаў трашчаць па ўсіх швах. Састаўлены з рознашэрсных элементаў, ён не вытрымаў напору большэвікоў і стаў распадацца на часткі. Створаны для барацьбы з большэвікамі Жнівеньскі блок у хуткім часе распаўся пад ударамі большэвікоў. Спачатку выйшлі з блока ўпяродаўцы (Багданаў, Луначарскі і інш.), потым выйшлі латышы, потым разбурыліся астатнія.

Папярпеўшы паражэнне ў барацьбе з большэвікамі, ліквідатары звярнуліся за дапамогай да II Інтэрнацыянала. II Інтэрнацыянал прышоў ім на дапамогу. Пад выглядам «прымірэння» большэвікоў з ліквідатарамі, пад выглядам устанаўлення «міру» ў партыі II Інтэрнацыянал патрэбаваў ад большэвікоў спынення крытыкі зголніцкай палітыкі ліквідатараў. Але большэвікі былі непрымірымы: яны адмовіліся адпарадкавацца рашэнням апартуністычнага II Інтэрнацыянала і не пайшлі ні на якія ўступкі.

Перамога большэвікоў у легальных арганізацыях не была і не магла быць выпадковасцю. Яна не была выпадковасцю не толькі таму, што толькі большэвікі мелі правільную марксісцкую тэорыю, ясную праграму і загартаваную ў баях рэвалюцыйную пролетарскую партыю. Яна не была выпадковасцю яшчэ таму, што перамога большэвікоў адлюстроўвала рост рэвалюцыйнага ўздыму.

Рэвалюцыйны рух рабочых усё больш разгортваўся, захватваючы новыя гарады і вобласці. З наступленнем 1914 года стачкі рабочых не толькі не сталі заціхаць, а, наадварот, сталі разгортвацца з новай сілай. Стачкі станавіліся ўсё больш упорнымі, захватвалі ўсё большую колькасць рабочых. 9 студзеня баставала 250 тысяч рабочых, з іх 140 тысяч — у Пецербургу. 1 мая баставала звыш поўмільёна, з іх у Пецербургу — больш 250 тысяч. У забастоўках рабочыя праяўлялі незвычайную стойкасць. На Обухаўскім заводзе ў Пецербургу забастоўка прадаўжалася больш двух месяцаў, на заводзе Леснер — каля трох месяцаў. Масавыя атручванні на радзе прадпрыемстваў Пецербурга выклікалі забастоўку 115 тысяч рабочых і следам за гэтым дэманстрацыі. Рух прадаўжаў нарастаць. Усяго за першае паўгоддзе 1914 года (уключаючы і пачатак ліпеня) баставала 1.425 тысяч рабочых.

У маі пачалася ўсеагульная забастоўка нафтапрамысловых рабочых у Баку, якая прыкавала да сябе ўвагу ўсяго пролетарыята Расіі. Стачка праходзіла арганізавана. 20 чэрвеня ў Баку адбылася дэманстрацыя 20 тысяч рабочых. Паліцыя прыняла супроць бакінскіх рабочых лютыя меры. У знак пратэсту і салідарнасці з бакінскімі рабочымі пачалася стачка ў Маскве, якая перакінулася ў іншыя раёны.

3 ліпеня на Пуцілаўскім заводзе ў Пецербургу адбыўся мітынг па поваду Бакінскай стачкі. Паліцыя страляла ў рабочых. Велізарнае ўзбуджэнне ахапіла пецербургскі пролетарыят. 4 ліпеня ў Пецербургу па заклику Пецербургскага камітэта партыі забаставала ў знак пратэсту 90 тысяч рабочых. 7 ліпеня баставала 130 тысяч, 8 ліпеня — 150 тысяч, 11 ліпеня — 200 тысяч.

Усе заводы былі ахоплены хваляваннем, усюды адбываліся мітынгі і дэманстрацыі. Справа дайшла да спроб будаваць барыкады. Барыкады будаваліся таксама ў Баку і Лодзі. У радзе пунктаў паліцыя страляла ў рабочых. Для падаўлення руху ўрад прадпрыняў «надзвычайныя» меры, сталіца была ператворана ў ваенны лагер, «Правда» была закрыта.

Але ў гэты час паявілася на сцэне новая сіла міжнароднага парадку — імперыялістычная вайна, — якая павінна была змяніць ход падзей. Якраз у часе ліпеньскіх рэвалюцыйных падзей у Пецербург прыехаў для перагавораў з царом аб пачатку прадстаячай вайны французскі прэзідэнт Пуанкарэ. Праз некалькі дзён Германія абвясціла вайну Расіі. Царскі ўрад скарыстаў вайну для таго, каб разграміць большэвіцкія арганізацыі і падавіць рабочы рух. Уздым рэвалюцыі быў перарван сусветнай вайной, у якой царскі ўрад шукаў выратавання ад рэвалюцыі.

КАРОТКІЯ ВЫВАДЫ

У годы новага рэвалюцыйнага ўздыму (1912—1914) партыя большэвікоў узначаліла рабочы рух і вяла яго пад большэвіцкімі лозунгамі да новай рэвалюцыі. Партыя здолела ажыццявіць палучэнне нелегальнай работы з легальнай. Ламаючы супраціўленне ліквідатараў і іх прыяцеляў — трацкістаў і адзавістаў, яна авалодала ўсімі формамі легальнага руху і зрабіла легальныя арганізацыі апорнымі пунктамі сваёй рэвалюцыйнай работы.

Змагаючыся з ворагамі рабочага класа і іх агентамі ў рабочым руху, партыя ўмацавала свае рады і расшырыла свае сувязі з рабочым класам. Шырока скарыстоўваючы думскую трыбуну для рэвалюцыйнай агітацыі і стварыўшы выдатную масавую рабочую газету «Правда», партыя выхавала новае пакаленне рэвалюцыйных рабочых — праўдзістаў. Гэты слой рабочых у годы імперыялістычнай вайны астаўся верны сцягу інтэрнацыяналізма і пролетарскай рэвалюцыі. Ён-жа складаў потым ядро большэвіцкай партыі ў дні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1917 годзе.

Напярэдадні імперыялістычнай вайны партыя кіравала рэвалюцыйнымі выступленнямі рабочага класа. Гэта былі авангардныя баі, якія былі перарваны імперыялістычнай вайной, але якія аднавіліся потым праз тры годы для таго, каб звергнуць царызм. У цяжкую паласу імперыялістычнай вайны большэвіцкая партыя ўступала з розгорнутымі сцягамі пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Група стаханаўцаў бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната гутарыць з дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР — рамшчыкам тав. М. І. Беляковым. Фото Л. Мазелева (СФ).

ВЯЛІКІ ГОНАР

Закон, прыняты Другой Сесіяй Вярхоўнага Совета СССР аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, паслужыў новым магутным штуршком у падрыхтоўцы да выстаўкі. Калгасы нашай ордэнаноснай БССР яшчэ больш узмацнілі падрыхтоўку да выстаўкі, на якой будуць дэманстраваць велізарныя перамогі соцыялістычнага земляробства.

Што робіць наш калгас «Вольная праца» у падрыхтоўцы да выстаўкі.

На агульным сходзе калгаснікаў мы дэтальна абмеркавалі закон Вярхоўнага Совета аб выстаўцы. Нашы стаханаўцы, вопытнікі ўнеслі рад каштоўных прапаноў па ўздыму ўраджайнасці. Усе калгаснікі паставілі сваёй мэтай і гарантаваць жаданнем заваяваць ганаровае права ўдзелу на выстаўцы па ільну і раду зернавых культур.

Па ўраджаю ільну 1937 года мы залічаны кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. Сёлета лён вырас куды лепшы, чым у мінулым годзе. На ўсёй плошчы ў 33 гектары лён-даўгунец быў прыгожы, чысты, высокі. У сярэднім з кожнага гектара мы мяркуем атрымаць не менш як па 7 цэнт. добраякаснага валакна.

Асабліва выдатныя ўраджаі маюць стаханаўскія звенні Звяно Галі Сільчанка якое складаецца з 5 жанчын, па нашых разліках дабілася з кожнага гектара па 10 цэнтн. валакна і 8 цэнтн. ільнасемя. Брыгадзір 6 брыгады Сяргей Вігера асабіста ўзяў 1 гектар ільну, на якім атрымаў 12 цэнтн. ільнаваланна.

Працуючы старшынёй калгаса, я адначасова рашыла кіраваць невялікім звяном, каб паказаць калгаснікам, якія багатыя ўраджаі можна атрымаць на нашай глебе.

Жанчыны майго звяна Хоўра Старасценка, Галіна Сільчанка, Вера Кісялёва ўвесь час працавалі не шкадуючы сіл, часна і аддана. Упартая, старанная работа дала бліскучыя рэзультаты. Лён дасягнуў росту ў 1 метр 25 сантыметраў. Мы ўпэўнены, што атрымаем 15 цэнтн. ільнаваланна і атрымалі ўжо 9 цэнтн. ільнасемя з аднаго гектара.

Выдатных поспехаў дабілася і звяно Праскоўі Науменка па канаплях. Яна таксама дасць не менш 15 цэнтн. пяньку.

Сёлета лета выдалася сухое. Аднак наш калгас ураджай зернавых атрымаў высокі, куды лепшы, чым у суседніх калгасах. І па зярну нашы стаханаўцы далі рэкордныя ўраджаі. Звяно Якава Назаранкі зняло 33 цэнтнеры ячменю з гектара, Ціта Агеенкі—30 цэнтнераў.

Зараз мы ставім сваёй задачай, каб увесь ураджай калгаса быў такі, як у стаханаўскіх звеннях.

Закончыўшы ўборку, ужо зараз клапоцімся аб ураджаі будучага года. Калгас поўнасцю закончыў сяўбу азімых: жыта — 250 гектараў, пшаніцы — 20 гектараў. Гаворачы аб азімай сяўбе нельга мінуць работу нашай Церахоўскай МТС. У той час, калі трэба сеяць, трактары МТС прастайваюць. Абяцанні дырэктара МТС тав. Жылкіна аб тым, што машыны будуць працаваць, астаюцца пустымі. Своечасова пасеялі азімыя, дзякуючы нашай комсамольска-маладзёжнай стаханаўскай брыгадзе. Маладыя калгаснікі і калгасніцы Нікалай Сільчанка, Васіль Жукаў, Міхаіл Харкун, Егор Сяўкуленка, Валя Шытова, Маня Вагера і інш. штодзённа выконвалі нормы выпрацоўкі на 150—200 процантаў.

Пры сяўбе захоўваліся ўсе агратэхнічныя правілы: сеялі выключна радковымі сеялкамі, ачышчаным кандыцыйным і пратручаным насеннем. Пад азімыя ўнеслі 230 цэнтнераў мінеральных угнаенняў і 2.000 цэнтнераў гною.

Восень уступіла ў свае правы. Неўзабаве зіма. У калгаснікаў будзе многа вольнага часу. Вось гэты час патрэбна поўнасцю скарыстаць для барацьбы за высокі ўраджай. У сваім калгасе мы ствараем агратэхнічныя гурткі. Аграномы МТС і райза павінны дапамагчы калгаснікам у авалоданні агратэхнічнымі ведамі.

Зараз усім калгасам неабходна разгарнуць падрыхтоўку да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. На аснове соцыялістычнага спаборніцтва, стаханаўскіх метадаў працы кожнаму калгасу патрэбна дабіцца права на ўдзел у выстаўцы. А ўдзельнічаць у выстаўцы—гэта вялікі гонар. Дабіцца-ж высокіх сталінскіх ураджаяў, прадэманструем на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1939 года бліскучыя перамогі калгаснага ладу.

А. Ц. КАРАЛЕНКА, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, ордэнаноска, старшыня калгаса «Вольная праца», Церахоўскага раёна.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ЗА БОЛЬШЭВІЦКАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

З дня справаздачна-выбарчага партсходу на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» прайшло каля 5 месяцаў і цяпер можна падвесці некаторыя вынікі таму, як партыйная арганізацыя ўлічыла крытыку комуністаў, як яна выконвае рашэнне справаздачна-выбарчага сходу.

Віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» з'яўляецца адным з буйнейшых швейных прадпрыемстваў у рэспубліцы. Яна аб'ядноўвае 4.376 рабочых, з іх 153 члены і кандыдаты партыі, 56 спачуваючых. Комсамольская арганізацыя налічвае ў сваіх радах каля 400 чалавек. З агульнага ліку ўсіх рабочых маецца каля 2.000 стаханаўцаў, сотні ўдарнікаў.

Новаму саставу партыйнага камітэта агульны сход даў наказ: звярнуць галоўную ўвагу на хутчэйшую рэалізацыю рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), асабліва ў частцы вырошчвання і вылучэння новых кадраў, на прыцягненне лепшых людзей фабрыкі ў групу спачуваючых і ў рады партыі, на арганізацыю кантролю за якасцю партыйнай вучобы, на далейшае разгортванне стаханаўскага руху, на павышэнне авангардной ролі комуністаў і комсамольцаў вытворчасці, на паляпшэнне кіраўніцтва комсамольскай і прафсаюзнай арганізацыі.

Трэба сказаць, што партком фабрыкі займаўся ўсімі гэтымі пытаннямі і безумоўна мае ў сваёй рабоце рад дасягненняў.

Партыйная арганізацыя правяла вялікую палітычную работу да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. На фабрыцы было арганізавана для беспартыйных рабочых 53 гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі з ахопам 1.342 чалавекі, працавала школа малапісьменных рабочых, у якой займалася 311 чалавек. На выбарчым участку працавала 45 агітатараў, у 42 гуртках займалася 1.075 выбаршчыкаў. У выбарчых камісіях прымала ўдзел 420 чалавек беспартыйнага актыва, 75 членаў і кандыдатаў партыі, 100 чалавек комсамольцаў.

Фабрыка за першае паўгоддзе ў цэнасным выражэнні выканала промфінплан на 102,5 проц., выпусціўшы прадукцыі на суму 21.328 тыс. рублёў супроць плана 20.813 тысяч рублёў.

Аднак партыйны камітэт у сваёй рабоце мае рад істотных недахопаў. Агітатарскі актыў які працаваў у часе выбараў, зараз не ўцягваецца ў актыўнае грамадска-палітычнае жыццё. Для яго не арганізавана вучоба. Палітмасавая работа ў цэхах праводзіцца слаба, асабліва па пытанню асвятлення міжнародных падзей.

У рэзультаце слабай работы з беспартыйным актывам партыйная арганізацыя за гэты перыяд вырасла на 20 чалавек. 10 чалавек пераведзены з кандыдатаў у члены партыі, 7 чалавек прынята ў групу спачуваючых. Пры такой вялікай колькасці актыва стаханаўцаў, ударнікаў, комсамольцаў — гэта яўна недастаткова.

Адным з момантаў гормаза росту партыйнай арганізацыі з'яўляецца наяўнасць сярод асобных комуністаў самастрахоўкі, якая выражаецца ў нежаданні даваць рэкамендацыі таварышам уступаючым у партыю. Напрыклад, у цэху па пашыву пальто рабочы-стаханавец тав. Гейзін ужо амаль год не можа атрымаць рэкамендацыі. Калі ён звярнуўся да члена партыі тав. Смаралзінскага які яго добра ведае разам працуе на працягу 15 год, апошні з дня ў дзень адкладвае дачу рэкамендацыі, заяўляючы: «даведаючыся, пагавару, праверу». Такія факты самастрахоўкі не адзінкавы.

Не палепшылася справа і з вучобай комуністаў. На першы погляд як быццам ахоплены вучобай усе комуністы, але калі праглядаеш журналы наведвання заняткаў, то зараз-жа гэтая думка рассейваецца. За апошнія тры месяцы колькасць пропускаў заняткаў дасягае 17 проц. Асабліва дрэнна абстаіць справа з вучобай спачуваючых. Ненаведванне заняткаў дасягае 50 проц., сярод комсамольцаў—25 проц.

Партком абмяркоўваў на сваім пасяджэнні гэтае пытанне, але бяда ў тым, што прымаемыя пастановы слаба выконваюцца, не правяраюцца. Адсюль цэлы рад недахопаў у рабоце.

Прэзрэнныя трацкісцка-бухарынскія фашысцкія шпіёны, дыверсанты, якія прабраліся на фабрыку, тварылі свае гнусныя справы. Але партарганізацыя фабрыкі, узброеная рашэннямі лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна, пры дапамозе слаўнай совецкай разведкі, разграміла варожыя змяіныя гнёзды. Выкарчоўваючы шкодніцкую шпіёнскую нечысць, здымаючы з кіруючых пастоў палітычных ратаеяў, бюракратаў, партарганізацыя вылучыла многа новых работнікаў, праверaных у барацьбе з ворагамі народа.

На фабрыцы за 1938 год вылучана на розныя кіруючыя пасады 37 таварышаў. Маладыя кадры з большэвіцкай палкасцю ўзяліся за ліквідацыю вынікаў шкодніцкай дзейнасці прэзрэнных ворагаў народа, за выкананне гаспадарчых і палітычных задач, пастаўленых перад фабрыкай партыяй і ўрадам.

Адным з станоўчых момантаў у рабоце партарганізацыі з'яўляецца пастаноўка абароннай работы. Тут маецца моцна скалочаная група ППХА. Калектыў фабрыкі мае 20 снайпераў, 150 чалавек варашылаўскіх стралкоў, 20 лётчыкаў, 1.449 значкістаў ППХА першай ступені, 549 значкістаў ГСА. Але разам з тым вельмі слаба пастаўлена арганізацыя масава-абароннай работы. Членаў Асоавіяхіма на фабрыцы ўсяго 1.649 чалавек, з іх членаў і кандыдатаў партыі 70 чалавек, 200 комсамольцаў. Адсутнічаюць палітгуткі на абаронныя тэмы, адсутнічае работа па ўцягванню новых членаў Асоавіяхіма.

Вельмі слаба надаецца ўвага рабоце нізавога фабрычнага друку. З 41 насценгазеты выходзіць толькі 20 і то нерэгулярна. Сярод рэдактароў няма ні аднаго члена партыі. На заметкі сценкораў не рэагуюць, рэдактароў з аднаго месца работы перакідаюць на другое, празмерна іх нагружаюць. Усё гэта прывяло да таго, што гэты важнейшы ўчастак партыйнай работы апазаўся ў прарыве.

Што неабходна для таго, каб ліквідаваць вышэйпаказаныя недахопы? Неабходна больш кіраваць пэхавымі партарганізацыямі, наладзіць штодзённы кантроль за выкананнем вынасімых пастаноў больш уцягваць у актыўнае палітычнае жыццё фабрыкі беспартыйных актыў асабліва звярнуўшы ўвагу на дасканалую падрыхтоўку адкрытых партыйных сходаў з тым, каб апошнія сталі сапраўднай школай ідэйна-палітычнага выхавання не толькі комуністаў, але і беспартыйных. Патрэбна заняцца пытаннем правільнай расстаноўкі комуністаў комсамольцаў на вытворчых участках фабрыкі, звярнуўшы асаблівую ўвагу на павышэнне авангардной ролі комуністаў на вытворчасці.

Партыйная арганізацыя мае ўсе магчымасці для таго, каб хутчэй ліквідаваць недахопы. Яна мае выдатных людзей, да канца адданых сваёй радзіме, партыі, а гэта — галоўнае.

А. ГЛОЗМАН,
П. ЕРШОЎ.

Баі на подступах да Ханькоу

Пасля падзення Сюйчжоу, у барацьбе за які японская армія страціла не падзін дзесятак тысяч забітымі і ранэнымі, японскае камандаванне намецила чарговы ўдар па так званаму Уханьскаму раёну.

***

Уханьскі раён, які стаў за апошнія тры месяцы аб'ектам японскага наступлення, складаецца з трох гарадоў: Ханькоу, Ханьян і Учан. Усе тры гарады размешчаны на беразе ракі Янцзы: Учан—на паўднёвым, Ханькоу і Ханьян—на паўночным.

Насельніцтва Уханьскага раёна перавышае 1.200 тыс. чалавек, з іх у Ханькоу жыве звыш 800 тыс. чалавек. Вядучым горадам Уханьскага раёна ў палітычных, эканамічных і ваенных адносінах з'яўляецца Ханькоу. З 800.000 насельніцтва гэтага горада налічваецца каля 4 тысяч іншакраінцаў.

Усе тры гарады размешчаны ў пункце перасячэння Бэйпін-Ханькоўскай чыгункі і ракі Янцзы, годнай для плавання буйных суднаў. Гэты раён звязан з Паўднёвым Кітаем Кантон-Ханькоўскай чыгункай, якая адыгрывае немалаважную ролю ў атрыманні Кітаем прадметаў узбраення праз Ганконг.

Умовы мясцовасці Уханьскага раёна часткова спрыяюць кітайскім войскам. Горы вакол горада ствараюць істотныя затрудненні японскім войскам.

Па свайму эканамічнаму значэнню Уханьскі раён займае ў Кітаі адно з важнейшых месц. Гэта відаць хапя-б з абарота знешняга і тым больш унутранага гандлю. У 1936 годзе на адзін толькі Ханькоу прыходзілася 15 проц. усяго ўнутрыгандлёвага абарота Кітая. Ханькоўскі порт у 1936 годзе займаў другое месца пасля Шанхая па імпарту і экспарту.

У мінулым Уханьскі раён па свайму прамысловаму значэнню займаў прыкладна пятае месца ў краіне. У гэтым раёне былі буйныя тэкстыльныя прадпрыемствы і некалькі металургічных заводаў. Ханькоу, напрыклад, з'яўляецца трэцім тэкстыльным цэнтрам Кітая.

З замежных прадпрыемстваў у Уханьскім раёне патрэбна раней за ўсё адзначыць буйныя бавоўнаачышчальныя і прэсавальныя заводы, якія належаць Англіі. Капіталаўкладанні Англіі тут перавышаюць 10 мільёнаў даляраў. У Ханькоу створан «спецыяльны 3-ці раён», які прадстаўляе сабой буйную англійскую канцэсію.

Да пачатку вайны Англія мела ў адным толькі Ханькоу 3 банкі і 14 гандлёва-прамысловых кампаній, маючых шматлікія прадпрыемствы. ЗША мелі там 2 банкі, адну авіяцыйную кампанію і некалькі місіянерскіх навучальных устаноў. Францыя — 2 банкі і адну прамысловую кампанію.

Такія ў самай кароткай форме асноўныя даныя аб Уханьскім раёне.

***

Накіроўваючы ўдар на Ханькоу, японскі генштаб улічваў, што падзенне Сюйчжоу не прывяло нават да частковай дэмаралізацыі кітайскіх войск, здолеўшых адыйсці на новыя пазіцыі без значных страт. У сваіх ацэнках перспектыў вайны, японскае камандаванне адкрыта прызнавала, што да таго часу, пакуль кітайская армія не зломлена, не можа быць і гутаркі аб паспяховым завяршэнні вайны.

Практычна гэта азначае, што японская ваеншчына, выпрабаваўшы сілу супраціўлення кітайскай арміі, у вышэйшай ступені заклапочана яе ўзрослай магутнасцю, якая пагражае ў канчатковым выніку паражэннем японскай зброі.

Такім чынам, адным з вельмі важных рухаючых матываў наступлення на Ханькоу з'явілася боязнь сілы кітайскай арміі, спроба ўсімі сродкамі і сіламі дэзарганізаваць яе. Трэба сказаць, што на вывад са строю кітайскай арміі, або на блізкае паражэнне яе японская ваеншчына ўжо цяпер не разлічвае.

Ваенныя дзеянні ў Ханькоўскім напрамку пачаліся ў першых лічбах чэрвеня. З таго часу прайшло ўжо звыш трох месяцаў, а Ханькоў па-ранейшаму моцна ахоўваецца кітайскімі войскамі. З велізарнай японскай арміі ў Кітаі пад Ханькоў сканцэнтравана значная яе частка, і тым не менш спробы авалодаць гэтым горадам перапяць пастаянныя няўдачы. Паспяховая абарона ўсяго Уханьскага раёна забяспечана, па-першае, добрай яе арганізацыяй, па-другое, прыкметным паляпшэннем аператыўна-тактычных прыёмаў кітайскай арміі.

Абарона Уханьскага раёна была пабудавана па папярэдне намечанаму і дэтальна абмеркаванаму плану, у якім улічаны не толькі чыста ваенныя мерапрыемствы, але і масава-палітычнае забеспячэнне ваенных дзеянняў. Натуральна, што калі тыл і перадавыя пазіцыі дзейнічаюць па адзінаму плану і пад адзіным кіраўніцтвам, вынікі атрымліваюцца зусім іншыя, чым гэта было ва многіх іншых раёнах у Кітаі.

Да гэтага трэба дадаць узрослую актыўнасць кітайскіх войск, асудзіўшых пасіўную абарону Кітайцы цяпер не толькі абараняюцца, але вельмі часта пераходзяць у контрнаступленне, разбіваючы праціўніка, зачастую выкарыстоўваючы яго-ж аперэцыйна-тактычныя прыёмы.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі зараз развіваюцца галоўным чынам уздоўж ракі Янцзы. Прыкладна ў канцы мінулага месяца японскае камандаванне прадпрыняла наступленне на Ханькоў адначасова шасцю калонамі. Галоўная маса войск вядзе наступленне ўздоўж паўднёвага і паўночнага берагоў Янцзы, прычым частка сіл напраўлена ў глыбокі абход Ханькоў з поўдня праз гор. Наньчан. За апошнія дні японцы панеслі цяжкае паражэнне ў раёне Жуйчана (паўднёвы бераг Янцзы), дзе японскія войскі спрабавалі перарваць кітайскую абарону. Калі на паўднёвым беразе японцам удаецца прасоўвацца наперад у дзень па 500—800 метраў, то на паўночным беразе іх наступленне зусім замарудзілася.

Нельга забываць, што японскае камандаванне вядзе па кітайскіх пазіцыях сільны камбініраваны агонь з паветра, сушы і ракі, прычым апошнія часы японцы шырока прымяняюць атрутныя газы нарыўнага дзеяння. У раёне на паўночны ўсход ад Дзяня (паўднёвы бераг Янцзы) японцы 7 верасня вялі на працягу многіх гадзін артылерыйскі абстрэл хімічнымі снарадамі.

Характэрным для ваенных дзеянняў у раёне Ханькоў з'яўляецца той факт, што японская армія, не гледзячы на прымяненне ёю усіх навейшых сродкаў барацьбы, не толькі не можа дабіцца рашаючага поспеху, але нават перапіць частковыя паражэнні на асобных участках фронта.

Кітайскі ўрад, лічучыся з магчымасцю працяглай вайны, прыняў рад мер для забеспячэння далейшай барацьбы супроць японскіх захватчыкаў. Найбольш буйныя і важныя ў ваенных адносінах прадпрыемствы Ханькоу, якія належаць Кітаю, эвакуіраваны ўглыб краіны. Гэты крок кітайскага ўрада выклікан тым, што японская авіяцыя, якая сістэматычна бамбардыруе Ханькоў, наносіць нямалыя страты фабрычна-заводскім прадпрыемствам Характэрна, што гэтая эвакуацыя зроблена вельмі ўмела, і эвакуіраваныя заводы і фабрыкі працуюць з поўнай нагрузкай.

Эканамічнае значэнне Уханьскага раёна для Кітая, зразумела, вялікае. Аднак у сувязі з пэлым радам мер, прадпрынятых урадам, страта гэтага раёна не адбілася-б на эканамічным становішчы краіны. Нават у тым выпадку, калі Ханькоў будзе страчан (што пакуль не прадбачыцца), кітайскі ўрад мае ў сваім распараджэнні невычарпальныя натуральныя багацці прылягаючых да Уханя правінцый, якія могуць забяспечыць прамысловасць і армію ўсімі відамі матэрыяльных сродкаў.

***

У Паўночным Кітаі ваенныя дзеянні развіваюцца галоўным чынам у паўднёвай частцы правінцыі Шаньсі ля згібу ракі Хуанхэ. Тут японскія войскі неаднаразова спрабавалі пераправіцца праз раку і абрушыцца на кітайскія часці, размешчаныя на паўднёвым беразе р. Хуанхэ. Аднак кітайцы з ранейшай сілай абараняюць пераправы, і японскія спробы фарсіравання ракі звычайна канчаюцца пяжкімі для іх стратамі.

Такая ў агульных рысах абстаноўка на франтах. Але ўяўленне аб ваеннай абстаноўцы ў Кітаі было-б не поўным, калі выпусціць з-пад увагі партызанскія дзеянні ў тылу японскіх акупантаў. Кітайскія партызаны выраслі ў такую магутную сілу, якая ставіць пад пагрозу ўсе японскія тэрытарыяльныя заваяванні, асабліва на поўначы. Агульнавядома, напрыклад, што правінцыя Хэбей (Паўночны Кітай) амаль напалову належыць партызанам, якія адваявалі яе ў японскіх войск.

Шматлікія выступленні партызан у тылу японскіх войск, якія наносяць японцам буйныя людскія і матэрыяльныя страты, не могуць не адбіцца на ходзе ваенных дзеянняў на фронце. Гэтым і тлумачыцца тое, што японскае камандаванне вымушана салідную долю сваіх сіл выкарыстаць у якасці карных атрадаў для барацьбы з партызанамі. Вынікі гэтых карных мер сапраўды плачэўныя.

Мільённую армію кітайскіх партызан, непарыўна звязаных з народам, знішчыць, зразумела, немагчыма. Больш таго, хваля партызанскага руху шырыцца з кожным днём. Часты выпадкі, калі японскія войскі, раніцой заняўшыя які-небудзь населены пункт, ужо к вечару падвяргаюцца нападу партызан, паспеўшых з арганізавацца за якія-небудзь 6—7 гадзін.

Лепшым паказальнікам таго, што японская ваеншчына перапіць яўныя няўдачы на франтах Кітая, служаць частыя за апошні час перакідкі войск з Японіі ў раёны ваенных дзеянняў.

Затрудненні на франтах у спалучэнні з велізарным напружаннем японскай гаспадаркі, выкліканым вайной, набліжаюць крах японскай авантуры ў Кітаі.

А. РАМІН.



Байцы кітайскай армії барыкадыруюць вароты горада, адваяванага ў японскіх захопнікаў. (СФ).

НА З'ЕЗДЗЕ АНГЛІЙСКАЙ КОМПАРТЫІ

ЛОНДАН, 19 верасня. (БЕЛТА). На адбываючымся XV з'ездзе англійскай компартыі першым выступіў член англійскага парламента Галахер. Галахер асудзіў палітыку Чэмберлена і ў прыватнасці яго паездку ў Германію, заявіўшы, што падобныя дзеянні накіраваны супроць захавання міру. Выказаўшыся затым за неадкладнае скліканне англійскага парламента, Галахер унёс прапанову аб скліканні Усенацыянальнай канферэнцыі рабочых і іншых дэмакратычных арганізацый Англіі для абмеркавання палітыкі ўрада.

З справаздачным дакладам выступіў генеральны сакратар англійскай компартыі Гары Політ. Указаўшы на ўсёўзрастаючы эканамічны крызіс у Англіі, Політ заявіў, што ў сучасны момант не менш 10 мільёнаў англійскага насельніцтва знаходзіцца ў выключна цяжкіх матэрыяльных умовах. У той-жа час урад Чэмберлена праводзіць рэакцыйныя меры, якія яшчэ больш пагаршаюць эканамічнае становішча англійскага рабочага класа і адначасова ўшчымляюць яго палітычныя правы.

Гэты ўрад, — падкрэсліў Політ, — выражае інтарэсы самай рэакцыйнай групы англійскай буржуазіі і з мэтай разгрому дэмакратыі робіць уступку за ўступкай фашызму.

Далей Політ заявіў аб гатоўнасці комуністычнай партыі Англіі аб'яднацца з лейбарыстскай партыяй, каб паспяхова змагацца за інтарэсы працоўных Англіі. Адначасова Політ выкрываў здрадніцкую ролю правага крыла лейбарыстскай партыі.

Далей Політ ахарактарызаваў здрадніцкую ролю трацкістаў як фашысцкай агентуры і падкрэсліў, што комуністычная партыя Англіі павінна строга ахоўваць свае рады ад пранікнення трацкісцкіх здраднікаў.

18 верасня на ранішнім пасяджэнні з'езда аднагалосна было прынята прывітанне Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў.

—о—

ГЕРМАНА-ВЕНГЕРСКАЯ ЗМОВА СУПРОЦЬ ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 20 верасня. (БЕЛТА). Па вестках з Будапешта, венгерскі рэгент (правіцель) Хорці выехаў у Германію і сёння, відавочна, сустрэнецца ў Берхтэсгадэне з Гітлерам. Як мяркуюць у добра інфармаваных колах, Германія катэгарычна паставіла перад Венгрыяй пытанне аб удзеле ў рыхтуючымся нападзе на Чэхаславакію, хаця-б у форме прадстаўлення германскай арміі венгерскай тэрыторыі «у крэдыт».

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ЧЭХАСЛАВАЦКІ НАРОД ПАТРАБУЕ АДХІЛЕННЯ АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІХ ПРАПАНОЎ

ПРАГА, 19 верасня. (БЕЛТА). Сёння ў 4 гадзіны дня англійскі пасланнік Ньютон і фрацнузскі пасланнік дэ Лакруа перадалі прэзідэнту Бенешу англа-французскія прапановы. Увесь дзень засядаў чэхаславацкі кабінет міністраў пад старшынствам прэзідэнта.

Да якіх рашэнняў прышоў урад, яшчэ невядома.

Усе газеты рэзка асуджаюць пазіцыю Англіі і Францыі і рэкамендуюць ураду заняць цвёрдую лінію і адхіліць «парады» Лондана і Парыжа.

Газета «Тэлеграф» піша: «Толькі два фактары — недатыкальнасць тэрыторыі, якая састаўляе адзінае гаспадарчае цэлае, і ўмацаваныя граніцы, якія ахоўваюцца арміяй — ёсць сапраўдная гарантыя існавання нашай рэспублікі. Аўстрыя таксама мела міжнародныя гарантыі вялікіх дзяржаў. Аўстрыя—злавесны прыклад, які заклікае нас да рашымасці абараняць усімі сіламі і сродкамі сваё жыццё, сваю дзяржаву і надзённыя інтарэсы нашага народа».

Зараз пачалося сумеснае пасяджэнне кіруючых органаў усіх каліцыйных партый у прысутнасці прэм'ер-міністра Годжы.

Увядзенне папярэдняй цэнзуры ў Чэхаславакіі

ПРАГА, 20 верасня. (БЕЛТА). Сёння апублікавана распараджэнне міністэрства ўнутраных спраў, згодна якога ўстанаўліваецца папярэдняя цэнзура на ўвесь штодзённы і перыядычны друк (газеты, журналы і інш.). Адначасова ўводзіцца цэнзура на ўсю паштовую карэспандэнцыю, прычым, усе пасылаемыя за граніцу пісьмы павінны здавацца на пошту толькі ў адкрытых канвертах.

Канцэнтрацыя польскіх і венгерскіх войск на чэхаславацкай граніцы

ВАРШАВА, 19 верасня. (БЕЛТА). Сёння вечарам у Варшаве вышлі экстраныя выпускі ўрадавых газет, афіцыяльна паведамляючых аб канцэнтрацыі польскіх войск на чэхаславацкай граніцы.

Польскі ўрад прабуе апраўдаць гэта мерапрыемства рознымі правакацыйнымі выдумкамі.

Наспех створаны польскім урадам так званы «камітэт барацьбы за правы палякаў у Чэхаславакіі» арганізаваў у Катавіцах антычэхаславацкі мітынг. Рэзалюцыя мітынга, якая трансліравалася па радыё па ўсёй Польшчы заклікае польскі ўрад прыняць усе меры да неадкладнага далучэння Цешынскай (чэхаславацкай) Сілезіі да Польшчы.

***

ПРАГА, 19 верасня. (БЕЛТА). Паводле атрыманых з паінфармаваных крыніц вестак, на граніцах Славакіі і Закарпацкай Украіны ў спешным парадку праводзіцца канцэнтрацыя венгерскіх войск. Адначасова венгерскі фашысцкі друк рэзка ўзмацніў антычэхаславацкую кампанію, патрабуючы расчлянення Чэхаславакіі.

Учора ў Будапешце адбыліся бурныя выступленні венгерскіх фашыстаў, якія патрабавалі адмены Трыанонскага дагавора (заключанага пасля сусветнай імперыялістычнай вайны паміж групай дзяржаў і Венгрыяй) і далучэння Славакіі да Венгрыі.

ПАСЯДЖЭННЕ АНГЛІЙСКАГА КАБІНЕТА

ЛОНДАН, 19 верасня. (БЕЛТА). Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, адбылося пасяджэнне англійскага кабінета, на якім быў цалкам адобран план, прыняты на нарадзе англійскіх і французскіх міністраў па чэхаславацкаму пытанню. Гэты план, указвае далей агенцтва, выключае правядзенне плебісцыта і выходзіць з прынцыпу перагляду існуючых граніц паміж Чэхаславакіяй і Германіяй. Даведзена да ведама чэхаславацкага ўрала аб змесце англа-французскага плана. Да атрымання ад яго адказу падрабязнасці прынятых рашэнняў астаюцца ў сакрэце.

Прэм'ер-міністр Чэмберлен, піша агенцтва, мяркуе ў другі раз вылецець у Германію 21 верасня.

РАШЭННІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 19 верасня. (БЕЛТА). Паводле паведамлення агенцтва Гавас, сёння днём адбылося пасяджэнне французскага совета міністраў. Пасяджэнне прадаўжалася паўтары гадзіны. Газетам перадана наступнае камюніке: «Далад'е і Банэ зрабілі даклад аб адбываўшыхся ў Лондане перагаворах і аб тых умовах, на якіх было дасягнута пагадненне з англійскім урадам. Совет міністраў аднадушна адобрыў заяву і пазіцыю старшыні совета міністраў, а таксама прапановы, высоўваемыя пагадненнем з англійскім урадам».

Водгукі на англа-французскі план расчлянення Чэхаславакіі

ПАРЫЖ, 19 верасня. (БЕЛТА). Англа-германскія планы расчлянення Чэхаславакіі і яе «нейтралізацыі» выклікалі энергічны адпор з боку найбольш дальнавідных французскіх палітычных дзеячоў.

Пертынакс піша ў газеце «Ордр»: «Залішне гаварыць аб тым, што прыняцце гітлераўскіх патрабаванняў у чэхаславацкім пытанні зробіць небяспеку вайны яшчэ больш грознай».

Рэакцыйны журналіст Анры дэ Керыліс у газеце «Эпок» заяўляе: «У Лондане ідуць на ўступкі, пры якіх умесна запытаць: «Што-ж ад гэтага часу аддзяляе ўступкі ад простай капітуляцыі?»

Габрыэль Перы у «Юманітэ» піша: «Існаванне незалежнай Чэхаславакіі, здольнай перашкодзіць гітлераўскай агрэсіі супроць Францыі, было для Францыі фактарам спакою. Да гэтага часу недахоп сыравіны прымушаў Германію да некаторай умеранасці. План прывезены Чэмберленам з Берхтэсгадэна (рэзідэнцыі Гітлера), разбурае гэтыя два элементы еўрапейскай бязпаснасці. Гэты план пазбаўляе Францыю яе чэхаславацкай саюзніцы і адкрывае Германіі шлях да хлеба і сыравіны, якіх Германіі нехапае. Адсутнасць французскай бязпаснасці набліжае развязванне вайны».

Калі-ж запрошаная дзяржава, адмаўляючыся прыняць на сябе абавязкі члена Лігі, у мэтах урэгулявання канфлікта прыбегне да вайны супроць члена Лігі, то да яе прымяняецца артыкул 16, які прадугледжвае санкцыі супроць агрэсара

ПРАМОВА АЛЬВАРЭСА ДЭЛЬ ВАЙО НА ПЛЕНУМЕ ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 19 верасня. (БЕЛТА). Сёння раніцой у агульнай дыскусіі па справаздачы генеральнага сакратара Лігі нацый на пленуме Лігі выступіў з вялікай яркай прамовай іспанскі міністр замежных спраў Альварэс дэль Вайо.

— У трэці раз, — сказаў ён, Іспанія з'яўляецца перад пленумам Лігі, як афіара агрэсіі. Яе прысутнасць тут—абвінаваўчы акт супроць тых, абавязкам якіх з'яўляецца выкананне статута Лігі, але якія замест гэтага лічаць за лепшае, каб Ліга нацый хутчэй загінула, і не робяць ніякіх сур'ёзных спроб пакласці канец руйнуючай рабоце ворагаў.

Іспанская дэлегацыя рашыла падтрыманнем прынцыпаў калектыўнай бязпаснасці выканаць свой абавязак да канца. Яна кляйміць усякае аслабленне статута Лігі нацый, бо гэта нанесла-б Ліге апошні ўдар.

Альварэс дэль Вайо падкрэсліваe, што ніколі за ўвесь час свайго існавання Ліга нацый не збіралася на пленум у такой цяжкай атмасферы бяссілля, нерашучасці і разгулу, гвалту і агрэсіі. Беспакараны напад на Іспанію і Кітай не можа не заахвочваць тых, хто ўрачыстасць неабузданага гвалту ператварыў у адзіную міжнародную рэальнасць. Найбольшая адказнасць за гэта падае не на саміх агрэсараў, а на іх саўдзельнікаў. Саўдзельнікі агрэсараў — гэта дзяржавы, якія ператварылі Лігу нацый у простае бюро рэгістрацыі яе ўласных паражэнняў. Іменна гэтыя дзяржавы і адказны за цяперашняе становішча.

Найвялікшы ўклад у справу ўсеагульнага міру, які рэспубліканская Іспанія можа сёння зрабіць у Жэневе—гэта прыклад паспяховага супраціўлення агрэсіі. Іспанскі народ гераічна супраціўляецца агрэсарам і тым самым аказвае вялікія паслугі справе міру. Іншыя дзяржавы сваёй бездапаможнасцю і нерашучасцю, а яшчэ больш сваёй уступчывасцю толькі падбадзёрваюць і ўмацоўваюць агрэсараў.

— Іспанія будзе прадаўжаць сваю барацьбу за нацыянальную незалежнасць да пераможнага канца — са ўсёй сілай падкрэслівае Альварэс дэль Вайо. Няхай не думаюць, што можна гандляваць кроўю соцен тысяч іспанцаў, якія палі не толькі ў абарону ўласнай краіны, але і ў абарону еўрапейскай дэмакратыі. Іспанія не з'яўляецца кавалкам тэрыторыі, які можа быць кінут на з'ядзенне агрэсарам для таго, каб часова задаволіць іх апетыты. Дзяржавы—члены Лігі нацый—не прысутнічаюць тут для таго, каб вялікія дзяржавы — таксама члены Лігі—ператварылі-б іх ў аб'ект гандлю.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ ФРОНТ

Іспанскае міністэрства абароны ў афіцыяльнай зводцы ваенных дзеянняў паведамляе, што 19 верасня часці мяцежнікаў у зоне Эбро прадаўжалі ярасныя атакі на пазіцыі рэспубліканцаў у раёне Гаэта і да паўночнага захада ад горнага масіва Парціда дэ Фанхунас. Пасля інтэнсіўнай кананады шматлікіх батарэй пры бесперапыннай бамбардыроўцы, якая праводзілася звыш 100 італа-германскімі самалётамі, пяхота фашыстаў, падтрыманая вялікай колькасцю танкаў, атакавала вышыні 496, 477 і 426. Рэспубліканцы поўнасцю адбілі гэтыя атакі, нанёсшы фашыстам цяжкія страты.

К канцу дня мяцежнікі аднавілі лютыя атакі на пазіцыі рэспубліканцаў, якія захоўваюць ранейшае размяшчэнне сваіх перадавых ліній. Артылерыя рэспубліканцаў прымусіла павярнуць назад фашысцкія танкі, вывеўшы пры гэтым адзін танк са строю. Авіяцыя рэспубліканцаў вельмі актыўна прымала ўдзел у баях.

Удзельнікі VI-й акруговай алімпіяды чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці выконваюць матроскі танец. Фото Мазелева (СФ).

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ТАРАСА ШЭЎЧЭНКІ

9 сакавіка 1939 года спаўняецца 125 год з дня нараджэння геніяльнага украінскага песняра - рэволюцыянера Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка. Для азнаменавання гадавіны Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР створан юбілейны камітэт. Вылучаны пісьменнікі і крытыкі, якія прачытаюць на прадпрыемствах, установах і ў часцях Чырвонай Арміі рад лекцый аб жыцці вялікага паэта. У асноўным закончан пераклад на беларускую мову выдатнага твора Шэўчэнка «Кобзарь». Над перакладам працавала брыгада паэтаў у складзе Купалы, Коласа, Бядулі, Броўкі, Глебкі і іншых. У бліжэйшы час пасля канчатковай зверкі тэкста ў Кіеве разам з украінскімі пісьменнікамі кніга (дзе здана ў друк.

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ле на ёсць творы Тараса Шэўчэнка украінскай, рускай, беларускай, гр зінскай і яўрэйскай мовах. Паасобн кнігі выдадзены ў 1844, 1876, 1883 інш. годах. Асаблівай папулярнас ў чытачоў карыстаецца бяссмерт твор паэта «Кобзарь». Да юбілею б ліятэка арганізуе вялікую выстаў прысвечаную Тарасу Шэўчэнка. Дзяржаўнай бібліятэкі УССР выпіса бібліяграфічныя і фотаматэрыялы паэце. Ужо атрыманы юбілейныя в данні паэм Тараса Шэўчэнка.

—о—

МОЛАДЗЬ АВАЛОДВАЕ ЛЁТНАЙ СПРАВАЙ

ОРША. Рабочая і калгасная моладзь раёна праяўляе вялікую пягу да авалодання лётнай справай без адрыву ад вытворчасці. У аэраклуб паступіла многа заяў. 50 процантаў падаўшых заявы — калгасная моладзь.

Малады калгаснік сельгасарцелі «Большэвік» тав. Ліхачоў Іван Сямёнавіч піша: «Я жадаю падрыхтаваць сябе для абароны з паветра сваёй м церы-радзімы. Прашу прыняць мя на вучобу лётчыкам».

У гонар XX гадавіны Ленінск Сталінскага комсамола 25 верас адбудзецца выпуск групы пілот якія вывучылі лётную справу без а рыву ад вытворчасці. Большасць в пускнікоў—равеснікі Кастрычніка.

—о—

НОВЫЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў БССР

У Лепелі пушчана ў эксплаатацыю новая гарадская электрастанцыя. У жылых дамах, культурна-бытавых установах запаліліся сотні электрычных лямп. Прамысловыя прадпрыемствы атрымалі электрычную энергію. Асветлены вуліцы.

Новыя электрастанцыі атрымае ў бягучым годзе рад другіх гарадоў і раённых цэнтраў рэспублікі. Да XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі заканчваецца электрастанцыя ў гор. Чэрвені. Новая станцыя на 100 кіловат будуецца ў раённым цэнтры — Карме, які знаходзіцца ў некалькіх дзесятках кілометраў ад чыгункі. Кошт работ і абсталявання—каля п мільёна рублёў. Энергію атрымаю прадпрыемствы, МТС і прылягаюч калгасы. Да канца года павінна бы закончана будаўніцтва станцыі ў раё ным цэнтры Копылі. Намечан увод эксплаатацыю першай чаргі новай гарадской электрастанцыі ў Мозы Пашыраецца гарадская электрастанц ў Слуцку. Магутнасць яе павялічва па амаль напалову.

На будаўніцтва і паляпшэнне ра ты комунальных электрастанцый БС у бягучым годзе адпушчана ка 9 мільёнаў рублёў.

—о—

ГАРАДОШНІКІ БССР—УДЗЕЛЬНІКІ ЎСЕСАЮЗНЫХ СПАБОРНІЦТВА

У Менску адбыліся спаборніцтвы на пяршынства па гарадках паміж камандамі таварыстваў «Харчавік» і «Бураве снік» Пераможцам у гэтай сустрэчы вышла каманда «Харчавіка».

Такім чынам каманда «Харчавік заваявала права на ўдзел ва ўсесаю ных спаборніцтвах, якія адбудуцца верасня ў Харкаве.

—о—

ШАХМАТНЫ ЧЭМПІЯНАТ БССР

Учора на шахматным турніры на першынства БССР, прысвечаным 20-годдзю Ленінска-Сталінскага комсамола, адбылося даігрыванне адкладзеных партый. Майстар Панаў выйграў у Ліліенталя і сыграў унічыю са Сталінскім. Жудро без ігры здаў адкладзеную партыю Ліліенталю і сыграў унічыю з Насцюшонкам.

Пасля васьмі тураў—на першым месцы майстар Панаў, які мае шэсць з паловай ачкоў з васьмі магчымых. За ім гросмейстар Ліліенталь і Маневіч— шасці. Камянецкі і майстар Дуз-Ха мірскі маюць па пяць ачкоў; майст Верасаў і Брэйтман—па чатыры; Ст шэўскі і Жудро—па тры з палова Насцюшонак, Сіліч і Іваноў—па тр Ратнікаў—два і на апошнім мес Кейліс — паўтара ачка.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

21 КАСТРЫЧНІКА 1938 г.

адкрыцце сезона

У памяшканні Бел. Дзярж. яўрэйскага тэатра.

Рэпертуар

НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ

Рымскі-Корсакаў ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА

Чайкоўскі ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА

Даргамыжскі РУСАЛКА

Пучыні ЧЫО-ЧЫО-САН

Узноўленыя пастаноўкі

Даержынскі ЦІХІ ДОН

Пучыні ТОСКА

Верді РЫГАЛЕТО

Гертэля МАРНАЯ ПЕРАСТЯРОГА (Тщетная предосторожность).

ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ ў касе тэатра на пастаянныя месцы і калектыўныя паходы з 12 да 2 г. і з 5 да 8 г. веч.

Гастролі Віцебскага Белардзяржтэатра (памяшк Белардзярждрамтэатра)

21 верасня

У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ

Пачатак у 8 г. веч

Каса адкрыта з 12 да 2 г. дня і з 5 да 8 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» Прафесар МАМЛОК

Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЦЫРК

Дзіцячы кінотэатр ДЗЯЦІНСТВА ГОРКАГА

Кіно «Спартак» ВЯСЁЛЫЯ РЭБЯТЫ

Кіно «Парыжская Комуна» (Цэнтр. парк культуры і адпачынку) АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Кінотэатр «Навіны дня» 1. Памяці Станіслаўскага. 2. Журнал «Піонерыя» № 7.

ДА ВЕДАМА РАЙВЕТЛЯЧЭБНІЦ, ВЕТПУНКТАЎ, ВЕТБАКТЛАБАРАТОРЫЯЎ І ІНШЫХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Рэспубліканская кантора „БЕЛВЕТСНАБЗБЫТ"

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО ВЕТСКЛАДАМІ

пачат ПРЫЁМ ЗАЯВАК на 1939 г. на веттавары

(медыкаменты, дэзсродкі, хірургічныя і заатэхнічныя інструменты, перавязачныя сродкі, біяпрэпараты, лабараторнае абсталяванне і рэактывы).

ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯВАК ДА 15 КАСТРЫЧНІКА 1938 г.

ЗАЯЎКІ ПРЫМАЮЦЦА ветскладамі ў гарадах: ОРША — Совецкая, 12; ГОМЕЛЬ — Н. Остроўскага, 58; ВІЦЕБСК — К. Лібкнехта, 3; МЕНСК — Комсамольская, 1/13; БАБРУЙСК — Слуцкая, 8.

Заяўкі прадстаўляюцца таму ветскладу, ад якога кліент снабжаўся ў 1938 г.

Форма заяўкі тая-ж, што і на 1938 г.

«БЕВЕТСНАБЗБЫТ».

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР

абвяшчае ПРЫЁМ

СПЕВАКОЎ І ТАНЦОРАЎ

у ансамбль беларускай народнай песні і пляскі.

ІСПЫТЫ будуць праводзіцца з 20 верасня г. г.

Праезд аплачваецца толькі прынятым на работу ў ансамбль.

ДЫРЭКЦЫЯ.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ званіце па тэлефону № 25-384

СЁННЯ, 21 ВЕРАСНЯ у 7 гадзін вечара Оргкамітэтам Менгорсовета па Кагановіцкаму раёну

склікаецца нарада

СТАРШЫНЬ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП, ЧЛЕНАЎ ГОРСОВЕТА, СТАРШЫНЬ КАМІСІЯЎ САДЗЕЙНІЧАННЯ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

ПА ПЫТАННЮ

перапісу насельніцтва.

На нараду запрашаюцца старшыні прафсаюзных арганізацый прадпрыемстваў установаў і навучальных устаноў.

Нарада адбудзецца ў клубе імя Леніна (пасажырскі вакзал).

ОРГКАМІТЭТ МЕНГОРСОВЕТА ПА КАГАНОВІЦКАМУ РАЁНУ.

ДА АСЕННЕ-ЗІМОВАГА СЕЗОНУ

ВЯЛІКІ ВЫБАР ГАЛАЎНЫХ УБОРАЎ

МУЖЧЫНСКІХ, ЖАНОЧЫХ І ДЗІЦЯЧЫХ, РОЗНЫХ ФАСОНАЎ, РАЗМЕРАЎ І РАСЦВЕТАК ПА АПОШНЯЙ МОДЗЕ.

ЁСЦЬ ТОЛЬКІ Ў МАГАЗІНАХ

МЕНГОРПРАМГАНДЛЮ.

У ПРОДАЖУ ЕСЦЬ:

МУЖЧЫНСКІЯ КЭПІ — ДРАПАВЫЯ, БАСТОНАВЫЯ І ІНШ.;

ЖАНОЧЫЯ — БЕРЭТЫ ФЕТРАВЫЯ З КАЎКАЗОСКАЙ ШЭРСЦІ, СКУРАНЫЯ—«МАЛЕНЬКАЯ МАМА» ШЛЯПЫ — ФЕТРАВЫЯ. МЕХАВЫЯ, ШОЎКАВЫЯ, ПЛОШАВЫЯ і інш.;

ДЗІЦЯЧЫЯ — СУКОННЫЯ КАПІТАНКІ, КЭПІ, ВЫРАЗНЫЯ ШАПАЧКІ І КАПТУРЫ.

Вялікі выбар розных КВЕТАК для шляп і плацця.

АДРАСЫ: МАГАЗІН № 31—СОВЕЦКАЯ, 39;

МАГАЗІН № 39—ЛЕНІНСКАЯ, 9;

МАГАЗІН № 1—ЛЕНІНСКАЯ, 13.

МЕНГОРПРАМГАНДАЛЬ.

ДА ЎВАГІ ШКОЛ, ЛЯЧЭБНЫХ УСТАНОЎ І ВОІНСКІХ ЧАСЦЕЙ!

МАГАЗІН МАСТАЦКАЙ ПРАДУКЦЫІ КОГІЗ'а

(МЕНСК, СОВЕЦКАЯ 73, ТЭЛ. 23-712)

ЁСЦЬ У ПРОДАЖУ і высылаюцца наложным плацяжом:

ГЕАГРАФІЧНЫЯ КАРТЫ.

Еўропа палітыч. — цана 28 р. і 23 р. Еўропа фізіч.—20 р. СССР—адм. палітыч. на палатне — 21 р. і без палатна — 3 р. СССР — адм. палітыч., нямая — 21 р. СССР — фізіч. — 18 р. Аўстралія і Ціхі акіян — 18 р. Паўшар'е, нямая — 18 р. Афрыка фізіч. — 22 р. Палітыч. карта свету, нямая — 22 р. Тапаграфічная карта — 14 р. Паўшар'е Заходн. фізіч. — 14 р. Паўшар'е Усходн. фізіч. — 14 р. Еўропа фізічн., нямая — 20 р. Паўшар'е палітыч. — 18 р. Паўднёвая Амерыка — 15 р. Паўночная Амерыка — 15 р. Еўрапейская частка СССР, на палках — 15 р. Азія фізіч. — 26 р. Чэхаславакія — 3 р. Афрыка, палітыч. — 6 р. і інш.

ГІСТАРЫЧНЫЯ КАРТЫ.

Еўропа XVII стагоддзя — 19 р. Дрэўняя Грэцыя — 17 р. Рымская імперыя — 20 р.

ГЛОБУСЫ.

Цана 7 р. 50 к. Розныя контурныя карты.

НАГЛЯДНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ.

Альбом па заалогіі — 13 р. 50 к. Карціны па гісторыі СССР — 3 р. Зона тайгі — 3 р. 50 к. Палярная зона — 3 р. 75 к. Перадача энергіі на адлегласць — 2 р. 50 к. Таблі па Менделеева — 4 р. Шрыфты — 1 р. 60 к. Карціны з свету жывёл— па 50 к. экз. Распаўсюджванне хімічных элементаў на зямной кары — 1 р. Літаратурныя таблі ад 1 р. да 1 р. 50 к. Фотаальбомы класікаў (Пушкін, Некрасаў, Дабралюбаў, Чэхаў і інш.) ад 18 р. да 37 р. і розн. інш. наглядныя дапаможнікі.

ГЕАГРАФІЧНЫЯ КАРТЫ таксама ПАТРАБУЮЦЦА ва ўсіх магазінах КОГІЗ'а ў гарадах БССР.

Уп. Галоўлітбела № К—5657. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Б.